ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 40 (4995) 12 кастрычніка 2018 г. ISSN 0024-4686

16+

Выкладчыца. Даследчыца. Дачка стар. 4

Свежыя часопісы. Пачытаем? стар. 6

Вялікі з мастацкім кіраўніком стар. 13

Паразуменне з творчым падыходам

падчас V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, што праходзіць у Магілёве

Гісторыка-культурны, турыстычны і гандлёва-эканамічны патэнцыял прадставяць розныя рэгіёны нашай краіны падчас V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбываецца гэтымі днямі ў Магілёве.

Адметныя традыцыі народаў увасобленыя ў творах дэкарытыўна-ўжытковага мастацтва і фальклоры. На працягу работы выстаўкі-кірмашу, якая збярэ рамеснікаў, будзе наладжана канцэртная праграма «Садружнасць культур — садружнасць народаў» з удзелам аматарскіх калектываў дзвюх краін.

Гэтымі днямі Магілёў чакае каля 2000 гасцей — удзельнікаў форуму.

Працяг на стар. 3 ►

Шматаблічнасць нацыянальнага

Бусел — птушка, што прыносіць добрыя весткі. Дакладна — для аматараў тэатра, таму што з'яўляецца сімвалам Нацыянальнай тэатральнай прэміі.

Яшчэ да пачатку паказаў спектакляў у межах конкурсу ў Купалаўскім тэатры прадстаўнікі і старшыні прафесійнага журы разважалі пра тое, чаго варта чакаць ад тэатральных пастановак сёлета. Далучыцца да разваг і спрэчак могуць гледачы: на працягу двух месяцаў у сталіцы можна азнаёміцца з лепшымі спектаклямі Беларусі.

Найлепшых назавуць падчас закрыцця V Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» 21 снежня на галоўнай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Працяг на стар. 13 ►

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 18040

Акцэнты тыдня:

краіна

Форум. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка возьме ўдзел у галоўных мерапрыемствах V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які з 10 да 12 кастрычніка праходзіць у Магілёве, паведаміла БелТА. Плануецца, што разам з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным кіраўнік дзяржавы выступіць на пленарным пасяджэнні форуму, тэма якога будзе прысвечана прыярытэтным кірункам развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва як ключавога фактару інтэграцыі і саюзнага будаўніцтва.

Віншаванні. Прэзідэнт Беларусі звярнуўся з віншаваннем да Мітрапаліта Філарэта, Пачэснага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, з нагоды 40-годдзя з дня прызначэння на Мінска-Беларускую кафедру. «Многія гады сілай маральнага аўтарытэту Вы дапамагалі аб'яднаць людзей з рознымі меркаваннямі і памкненнямі, знаходзіць правільныя рашэнні ў складаных сітуацыях. Дзякуючы Вашай дзейнасці хрысціяне Беларусі давяраюць Праваслаўнай царкве як апірышчу духоўнасці і высокіх маральных каштоўнасцяў», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў народнага артыста Беларусі Валянціна Дудкевіча з 75-годдзем. Прэзідэнт адзначыў, што шматгадовы творчы шлях артыста з'яўляецца яркім прыкладам сапраўднага служэння нацыянальнаму мастацтву. «Вы заваявалі аўтарытэт і павагу сярод працаўнікоў культуры, атрымалі шырокае прызнанне гледачоў не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі», — адзначаецца ў віншаванні. «Вашы пастаноўкі адрозніваюцца жывасцю выяў і багаццем мастацкіх рашэнняў. Вы ўзнялі беларускі танец на вяршыню прафесійнага майстэрства і пры гэтым захавалі яго характэрнасць, самабытнасць і каларыт», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі адрасаваў віншаванне народнаму мастаку СССР Аляксандру Шылаву з 75-гадовым юбілеем. «У Беларусі Вас ведаюць і шануюць як таленавітага мастака і рознабакова адоранага чалавека, таму Вашы персанальныя выстаўкі заўсёды становяцца яркімі падзеямі ў жыцці нашай краіны», — гаворыцца ў віншаванні. «У сваіх работах Вы вельмі дакладна раскрываеце індывідуальнасць чалавека, яго ўнутраны свет і духоўнае багацце, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Упэўнены, што і надалей Вы будзеце радаваць нас сваім мастацтвам, спрыяць умацаванню культурных сувязяў паміж двума братэрскімі народамі».

Памяць. Выстаўка «829 дзён» пра жыццё Гомеля падчас нямецка-фашысцкай акупацыі сёння адкрываецца ў абласным цэнтры ў палацы Румянцавых і Паскевічаў, паведамілі ў дзяржаўнай гісторыка-культурнай установе «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль». Выстаўка прымеркаваная да 75-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое адзначаецца 26 лістапада. У аснове экспазіцыі — дакументальныя крыніцы з фондаў музея, фотаматэрыялы і дакументы з прыватных калекцый. Убачыць гісторыю тых трагічных дзён можна будзе да пачатку снежня.

Малая радзіма. Пастаянная галерэя твораў народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча пачынае працаваць у курортным пасёлку Нарач Мядзельскага раёна. Цяпер атрымаць асалоду ад творчасці земляка могуць і аматары мастацтва на яго малой радзіме. Наведвальнікам прадставяць 130 работ майстра. Сярод іх — ілюстрацыі да твораў класікаў беларускай і сусветнай літаратуры, станковыя работы, акварэлі і малюнкі. Значнае месца ў творчасці Васіля Шаранговіча займаюць пейзажы, галоўным чынам гэта мядзельскія краявіды. Агульная плошча экспазіцыі складае 210 кв. м.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

Стасункі

Паліцы для сяброў

Абмяркоўваецца магчымасць адкрыцця ў Мінску кніжнай крамы «Дружба» з паліцамі выданняў розных краін. Пра гэта паведаміў першы намеснік генеральнага дырэктара «Белкнігі» Генадзь Сілінскі падчас падвядзення вынікаў удзелу ў XII Міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы друкаванай прадукцыі і навуковай канферэнцыі «Кніга — шлях супрацоўніцтва і прагрэсу» ў Туркменістане. Беларуская дэлегацыя вярнулася са шматлікімі ўзнагародамі і новымі ідэямі.

— Мы працягваем рабіць крокі да ажыццяўлення ідэі адкрыць у Мінску краму, у якой будуць створаны кніжныя паліцы выдавецтваў розных краін. Назву праекту ўжо далі — «Дружба». У мінулым месяцы адкрыліся паліцы Кітайскай Народнай Рэспублікі, цяпер плануем выставіць лепшыя выданні Туркменістана, — расказаў Генадзь Сілінскі.

Усяго ў ашхабадскай выстаўцы ўзяло ўдзел больш як 20 краін свету, сярод якіх каля 150 прадстаўнікоў з ЗША, Польшы, Ірана, Румыніі, Расіі, Украіны і інш. Ад Беларусі было прадстаўлена шэсць выдавецтваў: «Мастацкая літаратура», «Народная асвета», «Беларусь», Выдавецкі дом «Звязда», «Пачатковая школа», «Бяловагруп», а таксама гандлёвае прадпрыемства «Белкніга». Прадстаўнікі беларускай дэлегацыі перамаглі адразу ў чатырох намінацыях з 7, а ў яшчэ адной занялі і трэцяе месца. Лепшымі сталі выданні Чынгіза Айтматава «Бураны паўстанак. І вякуе дзень даўжэй за век» («Народная асвета»), «Беларускі касцюм» («Беларусь»), Валянціны Паліканінай «Ни к чему быть одному» («Мастацкая літаратура») і «Развіццё маўлення» («Пачатковая школа»). Дыплом трэцяй ступені атрымала выданне «Беларусь — пасланне міру» («Бяловагруп»).

— З нашага боку туркменскай літаратуры ўдзяляецца вялікая ўвага, і мы друкуем творы сучасных туркменскіх паэтаў, празаікаў і крытыкаў. Што датычыцца публікацыі твораў беларускіх аўтараў у Туркменістане, ідзе вельмі актыўная работа ў самых розных літаратурных выданнях, у прыватнасці ў часопісе «Сусветная літаратура» і газеце «Літаратура і мастацтва». Там друкуюцца творы Міколы Мятліцкага, Таццяны Сівец, Алеся Карлюкевіча, Сяргея Трахімёнка, Ірыны Карнавухавай і многіх іншых пісьменнікаў, — падкрэсліў дырэктар «Мастацкай літаратуры» Алесь Бадак.

Выстаўка доўжылася два дні, на працягу якіх беларускія кнігавыдаўцы і кнігараспаўсюджвальнікі змаглі паўдзельнічаць у мностве цікавых сустрэч з туркменскімі калегамі, аўтарамі, адзнакамі асобамі. Адной з такіх стала сустрэча намесніка дырэктара выдавецтва «Народная асвета» Юліі Дашкевіч з намеснікам дэкана Кітайскага інстытута нафты і газу, па выніках якой дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб рэалізацыі сумеснага ўзаемавыгаднага кніжнага праекта, які павінен ажыццявіцца на мінскай кніжнай выстаўцы. Пытанні перспектыўнага развіцця беларуска-туркменскіх культурных сувязяў былі абмеркаваны падчас рабочай сустрэчы беларускай дэлегацыі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Туркменістане Алегам Табанюховым.

Яўгенія ШЫЦЬКА

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

ПАЧУЦЦЯЎ ШЧЫРЫЯ РАДКІ...

У межах праекта «Фарбы Берасцейшчыны» госці з Брэста наведалі Арэхаўскую школу Маларыцкага раёна. У складзе дэлегацыі — журналіст, паэт Георгій Тамашэвіч, знакаміты аграрый і грамадскі дзеяч Аляксей Скакун, намеснік старшыні Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ паэтэса Любоў Красеўская, арганізатар творчай сустрэчы прафесар кафедры беларускай і рускай моў Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта Марыя Жыгалава і аўтар гэтых радкоў.

Старшакласнікі з увагай слухалі аповеды літаратараў пра жыццё і творчы лёс, задавалі вострыя пытанні, глядзелі відэапрэзентацыі, прысвечаныя дзейнасці пісьменніцкай суполкі, прыслухоўваліся да паэтычных радкоў… Георгій Тамашэвіч засяродзіў увагу на значнасці друкаванага слова і аздобіў сустрэчу рознатэматычнымі вершамі. Пра тое, як праца на роднай зямлі выхоўвае чалавека, распавёў Аляксей Скакун. Любоў Красеўская прадставіла кнігі, выдадзеныя ў Расіі і Польшчы. Марыя Жыгалава прааналізавала паэтычныя творы і зачытала ўрыўкі са сваіх навуковых прац.

Юныя ўдзельнікі імпрэзы пераканаліся, што пісьменнік — гэта перш-наперш знаўца чалавечай душы, нястомны рупліўца, які глядзіць глыбока ў мінулае і бачыць далей чым у заўтрашні дзень.

Літаратары падарылі школьнай бібліятэцы свае кнігі, калектыўныя зборнікі.

Напрыканцы старшакласнікі правялі для гасцей запамінальную экскурсію па Пушкінскім музеі, які быў створаны па ініцыятыве і намаганнямі Марыі Жыгалавай. Штогод музей папаўняецца новымі экспанатамі, мацуюцца творчыя сувязі з гарадамі і мястэчкамі, дзе цэняць рускага класіка. Атмасферу ўтульнасці і парадку ва ўстанове зберагае дырэктар гэтай школы Галіна Сахарчук.

Паездка ў глыбінку, дзе шануюць мастацкае слова і культурныя традыцыі, стала для пісьменнікаў аддзялення адметнай падзеяй. Запомніцца сустрэча і арэхаўцам за магчымасць пачуць жывое слова і акунуцца ў творчую атмасферу.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ,
старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ

Конкурсы

Запрашаюцца юныя чытальнікі

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі прапануе юным аматарам мастацкага чытання паўдзельнічаць у творчым конкурсе чытальнікаў беларускай паэзіі.

Адборачныя туры пройдуць ва ўстановах культуры з лістапада па сакавік 2019 года. Узрост удзельнікаў творчага спаборніцтва — да 30 гадоў. Конкурс праводзіцца пры партнёрстве і ўдзеле Асацыяцыі абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд».

Вынікі будуць падведзены ў маі будучага года падчас гала-канцэрта на Мінскім гарадскім фестывалі беларускай паэзіі і песні. Лаўрэаты атрымаюць дыпломы фестывалю, памятныя статуэткі і падарункі, а таксама змогуць выступіць на гала-канцэрце фэсту.

Удзельнікам конкурсу прапануюць прачытаць два творы: верш класіка беларускай паэзіі і верш сучаснага беларускамоўнага ці рускамоўнага паэта Беларусі.

Конкурсныя творы і заяўкі на ўдзел у творчым спаборніцтве з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, года нараджэння, адраса, навучальнай установы і кантактнага тэлефона накіроўваць на адрас: 220034, вул. Фрунзэ, 5, каб. 309, г. Мінск. Або на электронную пошту: *mgo-oo-spb@mail.ru*.

Заяўкі прымаюцца да 1 сакавіка 2019 года. Тэлефон для даведак: 392-59-06; 335-28-18.

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

15 кастрычніка *— на паэтычна-песенную імпрэзу «Ходзіць восень па дарожцы» з удзелам Іны Фраловай у дзіцячую бібліятэку № 15 (11.00).*

15 кастрычніка *— на ўрок мужнасці з удзелам Міколы Мятліцкага ў Мемарыяльную залу Дома літаратара (15.00).*

16 кастрычніка *— на пасяджэнне літаратурнага клуба «Слова» пры публічнай бібліятэцы № 3 (14.00).*

16 кастрычніка *— у літаратурны клуб «Паэтычны аўторак» пры публічнай бібліятэцы № 7 на сустрэчу з паэтамі (15.00).*

16 кастрычніка *— на прэзентацыю кнігі Міколы Чарняўскага «Дажынкі» ў публічную бібліятэку № 5 (16.00).*

17 кастрычніка *— у студыю юных літаратараў «Шабаноўскія званочкі» пры дзіцячай бібліятэцы № 3 (11.00).*

17 кастрычніка *— на прэзентацыю кнігі вершаў Вольгі Коваль «Батлейка» ў Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (17.30).*

17 кастрычніка *— на канцэрт духоўнай паэзіі і музыкі ў межах дзён праваслаўнай культуры ў Мастацкую галерэю «Універсітэт культуры» (17.00).*

18 кастрычніка *— на свята дзіцячай кнігі з удзелам пісьменнікаў аддзялення ў СШ № 92 (10.00).*

18 кастрычніка *— у Мінскі гарадскі навучальна-аздараўленчы цэнтр «Лідар» (п. Ждановічы) на сустрэчу з Міхаілам Галдзянковым і Інай Фраловай (15.00).*

18 кастрычніка *— у паэтычны клуб «Парнас» пры Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа на сустрэчу са Святланай Мельнікавай (Беларусь) і Русланам Піваваравым (Украіна) (16.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

12 кастрычніка *— на інфармацыйную гадзіну, прысвечаную тэме малой радзімы «Як лёгка дыхае зямля...», з удзелам Алены Папко ў Агародніцкую сярэднюю школу Бярозаўскага раёна (13.00).*

18 кастрычніка *— на пасяджэнне Школы маладога літаратара ў офіс абласнога аддзялення СПБ (17.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

13 кастрычніка *— на заняткі школы маладога рэпарцёра пад кіраўніцтвам Ліны Багданавай у СШ № 12 г. Гродна (13.30).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

13 кастрычніка *— на літаратурна-музычную імпрэзу «Пра тую, хто дорыць жыццё і цяпло», прысвечаную Дню маці, з удзелам Міколы Леўчанкі ў Быхаўскі раённы цэнтр культуры (15.00).*

15 кастрычніка *— на паэтычную гадзіну «Мы ўсе жывём пад зоркамі матуль» (да Дня маці) у Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна з удзелам членаў абласнога аддзялення СПБ (14.00).*

З нагоды

ПАРАЗУМЕННЕ З ТВОРЧЫМ ПАДЫХОДАМ

Выстаўка-кірмаш рамёстваў «Горад майстроў», якая разгарнулася ў межах форуму, здзіўляе не толькі маштабамі, але і разнастайнасцю народнай дэкаратыўна-ўжытковай творчасці, характэрнай для ўсіх рэгіёнаў Беларусі і 16 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі.

Выстаўка-кірмаш складаецца з трох тэматычных вуліц. Адна з іх, пад назвай «Беларуская», дэманструе дасягненні айчынных майстроў у салома- і лозапляценні, ткацтве, вышыўцы, мастацкай апрацоўцы дрэва, ганчарстве, прадстаўляе традыцыйнае нацыянальнае адзенне, выцінанку, беларускую ляльку і інш.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Магілёўская вобласць падрыхтавала асобную экспазіцыю «Кірмаш памагілёўскі». Тут можна пазнаёміцца з аб'ектамі нематэрыяльнай спадчыны, рэгіянальнымі святамі — «Горскі кірмаш» (Краснапольскі раён), «Ільінскі кірмаш» (Касцюковіцкі). Майстры з Круглянскага раёна пазнаёмяць з багаццем і разнастайнасцю традыцыйнай беларускай лялькі. Прадстаўнікі Слаўгарадчыны парадуюць вядомым далёка за межамі вобласці брэндам «Гаспадарчы сыр». Можна паўдзельнічаць у рамесніцкіх майстар-класах.

Яшчэ адна вуліца — «Сябрына творчасці і майстэрства» — аб'яднае творчасць лепшых майстроў Расіі і Беларусі. І, нарэшце, вуліца «Руская» з нацыянальнымі рускімі вырабамі. Гэта тамбурная вышыўка, старааскольская гліняная цацка, кропкавы роспіс, мастацкая апрацоўка бяросты, дэкаратыўныя інсталяцыі з каляровага шкла і металу, кажлянская цацка, марыйская вышыўка і многае іншае.

На форуме працуе некалькі канцэртных пляцовак. Праграма грунтуецца на фальклорным матэрыяле: творчыя калектывы Беларусі і Расіі акунуць гледачоў у дзіўнае багацце народнай творчасці сваіх рэгіёнаў.

Міра ІЎКОВІЧ

Імкнуцца за папараць-кветкаю

Як нашы нацыянальныя адметнасці раскрыюцца для спартыўных заўзятараў Еўропы?

Цырымоніі адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў у Мінску ў чэрвені 2019 года падрыхтуе расійская кампанія «Арт Сіці 5» пад кіраўніцтвам кампазітара і прадзюсара Ігара Крутога (згодна з дамовай паміж кіраўніцтвам кампаніі і Белдзяржфілармоніяй, якая адказвае за гэтыя творчыя дзеі). Паводле слоў міністра культуры Рэспублікі Беларусь Юрыя Бондара, беларускі бок вывучаў досвед стварэння падобных шоу ва ўсім свеце, вёў перамовы са спецыялістамі розных краін, але спыніў свой выбар на расійскай кампаніі.

Шоу адкрыцця павінна быць грандыёзнае і выклікаць цікавасць гледачоў ва ўсім свеце. Мастацкая ідэя — Беларусь і беларусы. Так паабяцалі абодва рэжысёры — расійскі Аляксей Сечанаў і беларускі Аляксандр Вавілаў, вядомы пастаноўкамі на фестывалі «Славянскі базар у Віцебску». Аляксандр Вавілаў адказвае і за сцэнар праграмы, які павінен быць завершаны да 25 кастрычніка. Беларускі рэжысёр зазначыў, што ў цэнтры будзе «чалавек, праз якога мы зможам расказаць еўрапейскаму гледачу пра нашу краіну». Ігар Крутой прызнаўся, што хоць не назаве сябе вялікім знаўцам гісторыі Беларусі, але цяпер яму, як генеральнаму прадзюсару, давядзецца ў яе паглыбіцца.

Больш сакрэтаў пра змест праграмы ўдзельнікі прэс-канферэнцыі не раскрылі. Маўляў, як будзе гатовы сцэнарый — тады пад яго вызначыцца і музычная канцэпцыя. І якую ролю ў шоу-адкрыцці будуць адыгрываць беларускія артысты, а якую — расійскія і іншыя замежныя, пакуль казаць немагчыма. Як і пра тое, ці напіша сам кампазітар нешта для цырымоніі. Але Ігар Крутой з упэўненасцю заявіў, што абавязкова выступіць нейкая музычная зорка сусветнай велічыні: мерапрыемствы такога ўзроўню, што транслююцца па ўсім свеце, вымагаюць прысутнасці зорак.

Вялікія спартыўныя падзеі, Алімпіяды, Універсіяды, а цяпер яшчэ і Еўрапейскія гульні, якія ўпершыню прайшлі ў Азербайджане ў 2015 го-дзе, традыцыйна суправаджаюцца яскравымі шоу адкрыцця і закрыцця. За апошнія гады гэтыя шоу выйшлі на новы ўзровень мастацтва, на новы ўзровень тэхналагічнасці і маштабнасці. Арганізатары мерапрыемстваў не шкадуюць грошай, над пастаноўкай працуюць лепшыя рэжысёры і артысты. Спартыўныя гульні, можна сказаць, спаборнічаюць і паміж сабою: чыя тэатралізаваная цырымонія запомніцца болей, якая выкліча больш эмоцый, якая ўвойдзе ў гісторыю. Натуральна, што кожная краіна-гаспадыня імкнецца праз такія шоу паказаць усяму свету сваю нацыянальную адметнасць, гісторыю, унікальнасць. І нам хочацца ўбачыць на мінскім стадыёне «Дынама» праграму з беларускай музыкай і артыстамі, заснаваную на айчыннай культуры і мастацтве, якая была б у адным шэрагу і з лагатыпам спаборніцтваў — папараць-кветкаю.

«Арт Сіці 5», як падкрэсліў Ігар Крутой, — кампанія поўнага цыкла, якая рэалізуе культурна-масавыя мерапрыемствы, што называецца, «пад ключ» і адказвае за ўсе этапы разам з трансляцыямі.

Надзея КУДРЭЙКА

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5 гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу з далейшым заключэннем кантракта ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:		
1	кафедра харавога дырыжыравання	— загадчык кафедры (1,0 шт. адз.) — дацэнт (1,0 шт. адз.)
2	кафедра драўляных духавых інструментаў	— дацэнт (1,0 шт. адз.) — загадчык кафедры (1,0 шт. адз.)
3	падрыхтоўчае аддзяленне	— старшы выкладчык (1,0 шт. адз.)
4	кафедра камернага ансамбля	— дацэнт (2,0 шт. адз.) — прафесар (1,0 шт. адз.) — загадчык кафедры (1,0 шт. адз.) — выкладчык (1,0 шт. адз.)
5	кафедра опернай падрыхтоўкі і харэаграфіі	— загадчык кафедры (1,0 шт. адз.) — прафесар (1,0 шт. адз.)
6	кафедра фартэпіяна	— дацэнт (2,0 шт. адз.)
7	кафедра кампазіцыі	— прафесар (1,0 шт. адз.)
8	кафедра канцэртмайстарскага майстэрства	— выкладчык (1,0 шт. адз.) — старшы выкладчык (1,0 шт. адз.)
9	кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін	— прафесар (1,0 шт. адз.)
10	кафедра спеваў	— прафесар (1,0 шт. адз.)
11	кафедра аркестравага дырыжыравання і інструментоўкі	— дацэнт (1,0 шт. адз.)
12	кафедра спецыяльнага фартэпіяна	— прафесар (1,0 шт. адз.)

ЛіМ КАЛЯНДАР

12 кастрычніка 70 гадоў адзначае Любоў Філімонава, паэтэса, празаік, пера-кладчык.

13 кастрычніка — 155 гадоў з дня нараджэння Льва Шапялевіча (1863—1909), гісторыка літаратуры, археолага.

13 кастрычніка — 130 гадоў з дня нараджэння Язэпа Драздовіча (1888—1954), мастака, скульптара, этнографа, фалькларыста, археолага, пісьменніка.

13 кастрычніка — 80 гадоў з дня нараджэння Віктара Філімонава (1938—1998), мастака-афарміцеля, графіка.

15 кастрычніка — 90 гадоў з дня нараджэння Юрыя Смірнова (1928—1997), спевака, заслужанага артыста БССР.

17 кастрычніка — 95 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Шумава (сапр. Шульман), празаіка.

17 кастрычніка — 80 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Тарасава (1938—1997), мастака тэатра, графіка, жывапісца.

17 кастрычніка 70 гадоў спаўняецца Ліліі Мялешцы, пісьменніцы.

18 кастрычніка 65-годдзе адзначае Валянціна Гіруць-Русакевіч, пісьменніца.

18 кастрычніка — 125 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Уладамірскага (сапр. Малейка) (1893—1971), народнага артыста БССР і СССР.

18 кастрычніка — 110 гадоў з дня нараджэння Абрама Трэпеля (1908—1969), рэжысёра, заслужанага артыста БССР.

18 кастрычніка 75 гадоў святкуе Генадзь Дзмітрыеў, паэт.

Пісьменнікі Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі глыбока засмучаны і выказваюць шчырыя спачуванні старшыні Віцебскага абласнога аддзялення СПБ Тамары Іванаўне Красновай-Гусачэнцы з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці МУЖА.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне старшыні Віцебскага абласнога СПБ Тамары Іванаўне Красновай-Гусачэнцы з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МУЖА.

Люстэрка тыдня:

свет

Мемарыяльны знак Янку Купалу ўсталяваны ў Фінляндыі, у горадзе Іматра. Міжнародны культурны праект па ўшанаванні народнага паэта Беларусі Янкі Купалы рэалізаваны па ініцыятыве Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Беларусь у Фінляндскай Рэспубліцы. Мемарыяльны знак, створаны скульптарам Паўлам Вайніцкім, — памяць пра візіт Янкі Купалы ў Фінляндыю ў 1910 годзе, дзе паэтам быў створаны верш-балада «Над Іматрай», прысвечаны сусветна вядомаму вадаспаду на рацэ Вуокса. Пра гэту яркую старонку біяграфіі паэта расказвала і выстаўка з фондаў музея, створаная ў межах міжнароднага праекта «Янка Купала ў дыялогу культур», якая экспанавалася ў мэрыі.

У Парыжы адбылася Нацыянальная цырымонія павагі і памяці Шарля Азнавура. На плошчы перад Домам інвалідаў сабраліся тысячы парыжан і гасцей сталіцы Францыі, каб праводзіць у апошні шлях сусветна вядомага спевака. У цырымоніі ўзялі ўдзел члены сям'і Шарля Азнавура, Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон, прэзідэнт Арменіі Армен Саркісян і прэм'ер-міністр Арменіі Нікол Пашынян, члены ўрада Францыі, прадстаўнікі грамадскасці, дыпламатычнага корпуса. На Нацыянальнай цырымоніі павагі і памяці вядомага артыста прысутнічаў пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка, паведамілі ў Пасольстве Беларусі ў Францыі.

Новае выданне Оксфардскага слоўніка папоўніла больш як сотня слоў, звязаных з развіццём кінематографа, паведамляе тэлеканал «МИР 24» са спасылкай на брытанскую газету *The Guardian*. Адзначаецца, што ў слоўнік увайшлі словы, утвораныя ад прозвішчаў вядомых рэжысёраў. Сярод іх — «таранціняда» *(Tarantinoesque)* і «кубрыкіяна» *(Kubrickian)*, якія даюць характарыстыку творчасці мэтраў кінематографа Квенціна Таранціна і Стэнлі Кубрыка. «Кубрыкіяна — перфекцыянізм, авалоданне тэхнічнымі аспектамі кінавытворчасці і атмасферны візуальны стыль у фільмах розных жанраў», — гаворыцца ў апісанні слова. У азначэнні да слова «таранціняда» пералічваюцца асаблівасці стылю Таранціна: нелінейныя сюжэтныя лініі, вострыя дыялогі, сатырычныя тэмы. У слоўнік таксама ўключаны тэрміны, утвораныя ад прозвішчаў рэжысёраў Дэвіда Лінча, Стывена Спілберга, Роберта Олтмэна ды іншых. Оксфардскі слоўнік — галоўны і самы вялікі слоўнік англійскай мовы, які штогод дапаўняецца неалагізмамі.

Дзеля ролі ў фэнтэзі-драме Come away Анджаліна Джолі стала бландзінкай. Актрыса будзе іграць Роўз, маці Пітэра Пэна і Алісы з Залюстаркоўя. Бацьку дзяцей выканае акцёр Дэні Оелоў. Новы фільм з'яўляецца прыквелам дзвюх самых вядомых брытанскіх казак — «Пітэра Пэна» Джэймса Мэцью Бары і «Алісы ў краіне цудаў» Льюіса Кэрала. Рэжысёрам карціны стала Брэнда Чэпман, якая атрымала «Оскар» за мультфільм «Храбрая сэрцам». Дата выхаду фільма на экраны пакуль невядомая.

У конкурсе часопіса *National Geographic Traveler* (Расійская Федэрацыя) Беларусь стала лепшай краінай для агратурызму, а беларус Леанід Пашкоўскі названы лепшым трэвэл-блогерам, паведаміла БелТА са спасылкай на сайт *National Geographic Traveler*. Беларусь перамагла ў намінацыі «Агратурызм» з 50 працэнтамі галасоў, абышоўшы ў чытацкім галасаванні Італію, Бразілію, Кітай і ЗША. Анлайн-галасаванне за лепшыя турыстычныя напрамкі сярод самых папулярных відаў адпачынку — *National Geographic Traveler Awards 2018* — праходзіла з 22 чэрвеня па 5 кастрычніка ў 25 асноўных намінацыях.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

ТАЦЦЯНА ШАМЯКІНА: «НАША БУДУЧЫНЯ — У НАШАЙ МІНУЎШЧЫНЕ»

На яе манаграфіях, артыкулах у літаратурна-мастацкіх выданнях і прафесійнай перыёдыцы для настаўнікаў і выкладчыкаў-філолагаў вырасла не адно пакаленне чытачоў. Гэта як асобы, якія прысвяцілі свой жыццёвы шлях вывучэнню айчыннай літаратуры, яе вытокаў, так і аматары беларускага слова. Дачка знанага народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, доктар філалагічных навук, прафесар Таццяна Шамякіна і сама за многа дзесяцігоддзяў плённай дзейнасці стала легендай даследчыцкай і філалагічнай працы. Адсвяткаваўшы днямі свой 70-гадовы юбілей, Таццяна Іванаўна яшчэ і цяпер займае пасаду загадчыка кафедры тэорыі літаратуры БДУ. Яна прызналася, што не любіць даваць інтэрв'ю, але пагадзілася пагутарыць з нашым карэспандэнтам. Натуральна, гаворка ішла пра творчыя і даследчыцкія набыткі, супрацу з калегамі і стаўленне да сучаснай айчыннай літаратуры.

— Таццяна Іванаўна, ваш даследчыцкі і выкладчыцкі шлях доўжыцца ўжо амаль паўстагоддзя. Гэта доўгі перыяд, у якім, магчыма, знойдуцца найбольш плённыя часы.

— З вялікім імпэтам я працавала ў 1990-я гады, тады займалася вывучэннем славянскай міфалогіі, рыхтавала вучэбны дапаможнік, курсы лекцый. Урэшце, гэтыя набыткі выліліся ў доктарскую дысертацыю, прысвечаную беларускай класічнай літаратурнай традыцыі ў сувязі з міфалогіяй. Такія працы навукоўцам звычайна даюцца з вялікай цяжкасцю, а ў мяне ўсё атрымалася неяк лёгка, склалася само сабой. Над тэмай працавала каля 10 гадоў, але нават не брала адпачынак, не паступала ў дактарантуру, увесь час выкладала, чытала курсы лекцый. Лічу, што і апошнія 7—10 гадоў — надзвычай плённыя. Штогод пішу не менш за 15—20 прац.

— Звычайна ў гэты час пачынаюць крыху ленавацца, спасылацца на ўзрост, агульную стомленасць і сямейныя клопаты, маўляў, усе дасягненні ўжо зробленыя. У вас атрымалася наадварот?

— Якраз цяпер працуецца лёгка. Дочкі выраслі, самі кандыдаты навук, узялі на сябе ўсе гаспадарчыя клопаты. А пішу я вельмі хутка, але, праўда, напісаўшы, доўга вывяраю, праўлю, перапрацоўваю стылістычна. Такі перфекцыянізм і патрабавальнасць да сябе выпрацаваліся з цягам часу. Радуе, што ўсё пакуль што атрымліваецца з лёгкасцю.

— Сёння многа разважаюць пра месца жанчыны ў літаратурным асяродку нашай краіны. Кажуць пра тое, што галоўныя кіруючыя пасады займаюць мужчыны, яны ж часцей атрымліваюць прэміі… Якое стаўленне адчуваеце да сябе з боку мужчын-калег?

— Калектыў філалагічнага факультэта ў цэлым, ды і нашай кафедры ў прыватнасці, — жаночы. Тут, наадварот, мужчын не хапае. Таму пра нейкую няўвагу на працоўным месцы я казаць не магу. Да фемінісцкага руху стаўлюся з іроніяй. Падаецца, што ў нашай гуманітарнай сферы існуе раўнапраўе полаў. А што датычыцца пасадаў бюракратычных, чыноўніцкіх, — відаць, сапраўды прыродай прызначана займаць іх мужчынам. Яны, лічу, лепшыя кіраўнікі. Сама ніколі да пасадаў не імкнулася, але так сталася, што ўжо 18 гадоў кірую кафедрамі: беларусазнаўства, беларускай літаратуры і культуры, тэорыі літаратуры.

— З узростам прасцей ці больш складана кіраваць калектывам выкладчыкаў?

— Проста так здарылася ў жыцці, сама я да такой працы не зусім прыстасаваная, мне не падабаецца кіраваць. Я па натуры не арганізатар, хутчэй — сузіральнік, тым не менш з нашымі выкладчыкамі вельмі лёгка працаваць, усе — добрыя людзі, выдатныя прафесіяналы. Сказаць, што становіцца цяжэй, не магу. З іншага боку, жыццё, грамадства змяняюцца, адносіны ў соцыуме ўскладняюцца неверагодна, а выкладанне літаратуры — гэта і выкладанне жыцця.

— Ваша сястра Алеся Іванаўна — таксама філолаг, кандыдат філалагічных навук у галіне тэксталогіі. Ці адчувалі нейкае саперніцтва ў даследаваннях, а, магчыма, яна імкнулася вас «дагнаць» у навуцы, як малодшая сястра — старэйшую?

— Што вы, якое спаборніцтва! *(Усміхаецца.)* Так, Алеся заўсёды са мной раілася, я была для яе ў нечым куратарам у працы, часам дапамагала, але яна ўжо даўно самастойны даследчык. Наша старэйшая сястра таксама філолаг, спецыяліст у выкладанні французскай і нямецкай моў. Мама таксама была філолагам. Да вайны

Фота Кастуся Дробава.

скончыла медыцынскае вучылішча, а пасля вайны, ужо маючы траіх дзяцей, атрымала дыплом (з адзнакай!) філалагічнага факультэта тагачаснага педагагічнага інстытута. Памятаю, калі была яшчэ маленькая, а мама ці рыхтавалася да экзаменаў, ці пісала нейкія работы, я пастаянна задавала ёй розныя пытанні. Часам яна распавядала цікавыя гісторыі з жыцця пісьменнікаў. Так што на філалагічныя тэмы мы пачалі размаўляць яшчэ з майго дашкольнага ўзросту. Можна сказаць, што ў нашай сям'і склалася ўсё арганічна і натуральна. Тры сястры прадоўжылі шлях бацькоў. Праўда, брат наш быў геолагам.

— Ваш бацька, народны пісьменнік Беларусі, знакаміты Іван Шамякін, напэўна, радаваўся навуковым поспехам дочак?

— Натуральна. Асабліва маім. Ён быў яшчэ жывы, калі я абараніла доктарскую дысертацыю і стала кіраўніком кафедры. Гэта было для яго вельмі прыемна.

— Ёсць і іншы бок сваяцтва са знакамітасцю. З аднаго боку, дзеці пачуваюцца няёмка ў цені славы бацькоў, а з іншага — звонку сямейных і сяброўскіх стасункаў падаецца, што многае вы атрымліваеце незаслужана і перад вамі апрыёры адчыненыя дзверы, да якіх звычайна не так і проста наблізіцца.

— Відаць, у маім жыцці прозвішча знакамітага бацькі сапраўды мела нейкае значэнне, адыграла сваю ролю. Неяк само сабою. Але лічу, што я дастаткова ў жыцці працавала, а не імкнулася скарыстацца іменем, каб нешта атрымаць. Маю больш як 500 друкаваных работ. Хіба гэтага мала? Калі вучылася ў школе, ва ўніверсітэце, то было вельмі сорамна ленавацца, не магла падвесці бацьку. Наадварот, усяляк імкнулася даказаць сваю стараннасць і ўласныя здабыткі, каб нават і не падумалі, што карыстаюся сваяцтвам. Рабіла як мага больш, каб не быць аб'ектам такіх размоў.

— Думаю, так і атрымалася.

— Не ведаю, што гавораць людзі. Хто добра мяне ведае, называе працаголікам. Але мой аднакурснік дагэтуль крыўдуе, што я заняла яго месца ў аспірантуры. Падаецца, дарэмна: па адзнаках я сапраўды ішла першая, але ён быў старастам нашага курса, таму лічыў, што варты стаць аспірантам. Аднак жыццё яго склалася выдатна, зрабіў бліскучую кар'еру, займаў самыя высокія кіруючыя пасады, а я — педагог. Па-мойму, для жанчыны ў наш час гэта таксама няблага.

— Вы ўжо назвалі сябе сузіральнікам па натуры. Чытаючы вашу публіцыстыку, успаміны, нельга не зрабіць акцэнт на змене падыходаў да пісьменніцкай працы, асобы творцы, падтрымкі з боку дзяржавы, што вы назіралі на працягу ўласнага жыцця.

— Пасля развалу Савецкага Саюза пісьменнікі вельмі рэзка адчулі сваю непатрэбнасць новым гаспадарам жыцця. Літаратура перастала быць цэнтрам культуры. Таму пачаўся заняпад і самой літаратуры, і ўзроўню пісьменніцкага попыту. Усе страшна збяднелі. Успамінаецца такі эпізод з пачатку 1990-х гадоў. Неяк я завітала да бацькоў і пабачыла ў іх кватэры незнаёмую жанчыну. Мае бацькі заўсёды былі вельмі гасцінныя і з задавальненнем размаўлялі з нечаканай госцяй. У працэсе гутаркі высветлілася: гэтая жанчына — прадпрымальнік. Яна распавяла, што займаецца продажам тканін, прычым паспяхова. Неяк даведалася, што інтэлігенцыя перажывае горшыя часы (а вы не ўяўляеце, як жылі ў ліхія 90-я!) і, каб неяк аддаць свой доўг Богу, вырашыла дапамагаць людзям. Таму хадзіла па кватэрах пісьменнікаў і проста раздавала кавалкі тканіны як падарункі. Пасля кватэры бацькі яна збіралася завітаць да Васіля Быкава… Гэта быў вельмі паказальны момант. Розніцу ва ўзроўні жыцця мы адчулі адразу, ды і ганарары страшна знізіліся. Сёння дык і ўвогуле пра ганарары нават смешна некаму расказваць…

— Але ці правільна, што пісьменнік мусіць пачувацца залежным ад кіраўніцтва дзяржавы? Галоўнае ж — задавальняць патрэбы калі не рынку ў цэлым, то асобных чытачоў, працаваць менавіта на сваю аўдыторыю.

— Мы служым не ўладам, а менавіта дзяржаве. Дзяржава — наша адзіная абаронца. Межы ж існуюць, яны не зніклі, хоць назіраецца тэндэнцыя да ліквідацыі нацыянальных дзяржаў. Гэта адзінае, што ў нас ёсць, мы можам спадзявацца на медыцынскую дапамогу, адукацыю і абарону менавіта з боку дзяржавы. Значыць, і мы самі павінны рабіць свой унёсак у агульную скарбонку, ахвяраваць сваёй працай, здольнасцю, талентам.

— Вы ўжо адзначылі зніжэнне цікавасці чытача да мастацкага слова высокага гатунку. Але ж кнігі паранейшаму выдаюць, набываюць і чытаюць, хай і ў меншым аб'ёме. Гэта таксама прыкмета часу?

— Людзям нешта патрэбна для душы, але часцей за ўсё гэтае памкненне задавальняецца сурагатамі. У прыватнасці, рознымі «мыльнымі операмі». Аднак і гэтыя прадукты масавай культуры эксплуатуюць набыткі, прыёмы, метады класічнай літаратуры, праўда, на самым нізкім узроўні. Публіка прывыкла да такіх твораў, таму чагосьці больш высокага і не патрабуе. Зараз многа гавораць пра выхаванне інтарэсу да чытання ў дзяцей, а яго і не будзе, калі бацькі ў сям'і не чытаюць. Значыць, да кнігі варта прывучаць усё насельніцтва. А як гэта зрабіць, калі ёсць тэлебачанне і інтэрнэт? Цэнтрычная роля літаратуры знізілася праз аб'ектыўныя прычыны.

— Самі сочыце за навінкамі на кніжных паліцах?

— Мае прыхільнасць і любоў засталіся ў мінулым. Мяне не цікавіць сучасная літаратура, бо ўсё жыццё займаюся класікай. Акрамя таго, захапляюся публіцыстыкай. Да гэтага часу выпісваю дваццаць розных выданняў. Магчыма, журналістыкай ужо і атручана: залішне многа яе паглынаю. Безумоўна, чытаю літаратурна-мастацкія часопісы, сачу за тым, якія кнігі выходзяць, рэкамендую іх студэнтам, але нешта вось так, адразу, прыгадаць не магу. Акрамя таго… Назавеш аднаго пісьменніка, а дваццаць пакрыўдзяцца. І правільна пакрыўдзяцца. Хоць прыдумляць не вельмі ўмеюць. Рэальнае жыццё — большы майстар на сюжэты. Люблю чытаць не мастацкую літаратуру, а мемуары, дакументалістыку, навукова-папулярныя кнігі на самыя розныя тэмы. Гэта бачна і па тым, пра што пішу сама. Напрыклад, пра космас, сацыяльныя з'явы, аналізую фантастычную літаратуру, савецкую і замежную. Нават калі казаць пра сучасную фантастыку, то і тут нічога асабліва не закранае, мабыць, толькі апошнія з раманаў Сяргея Лук'яненкі «Чарнавік» і «Чыставік». Гэтая прыхільнасць да фантастыкі ў мяне засталася з юнацтва. Калі ж браць літаратуру больш высокага ўзроўню, тут аддаю перавагу класіцы. Наша будучыня — у нашым мінулым. Неабходна вяртанне да класічных традыцый, і ўжо на іх аснове можна зрабіць нейкі прарыў.

— У літаратуразнаўстве вам таксама бліжэй класічная метадалогія?

— Тут я прыхільнік міжпрадметнага падыходу, калі тэорыя літаратуры імкнецца ажыццявіць больш шырокія выхады ў іншыя сферы — сацыялогію, грамадазнаўства, палітыку, гісторыю. Калі літаратуразнаўства не замыкаецца ў сваім вузкім коле, і мы бачым сінтэз навук. Але як гэта зрабіць практычна? У выкладанні ўдаецца лепш, чым у непасрэдным літаратуразнаўчым аналізе твораў. Магчыма, таму мяне апошнім часам больш цягне да навукова-папулярных кніг і мемуарыстыкі. Пачаўся новы этап антысаветызму з акцэнтам на побыт. Многія імкнуцца паказаць, як бедна, брудна і нецікава жылі савецкія людзі. Але насамрэч усё было наадварот, ва ўсялякім разе, цікаўнасці да жыцця, да навук у нас, маладых, было больш, чым у эпоху інтэрнэту ў сучаснай моладзі. І мне хацелася б пра гэта больш расказаць. Не ведаю, ці атрымаецца і ці зацікавіць чытачоў такі падыход.

Марына ВЕСЯЛУХА

Іранічная пачуццёвасць Эдзі Агняцвет

Вершам Эдзі Агняцвет уласціва лёгкасць і танцавальнасць. Шчасце для гэтай цудоўнай паэтэсы, з дня нараджэння якой 11 кастрычніка споўнілася 105 гадоў, не мае прыкрых рысаў манументальнай сацрэалістычнай пафаснасці, а ўяўляецца нейкім выпадковым, прыемна-нечаканым сюрпрызам.

Вось адчувае наша гераіня, што «не хапае свежага глытка паветра і спагады», і раптам: «...жэўжык-ветрагон / з разбегу / Паднёс мне гронку арабіны: / — Гэта вам! / Пацалавала б шчодрую далоньку! / Але дзе там?» (з верша «Пурпуровыя хмаркі ахуталі дрэвы...», 1993).

Паехала Эдзі Агняцвет у Балгарыю, зусім забыўшыся, што дзесьці «мілы... чакае ў Мінску / Маіх тэлеграм і лістоў». Паэтэса, магчыма б, вярнулася ў сям'ю і раней, але ж неспадзявана яе «закруціў красавік!», які «падманшчык вядомы, / ён пачуцці і даты / Заўжды пераблытаць гатоў!» Больш за тое, гэты спакуснік-красавік на бераг ракі (ізноў жа зусім нечакана!) «Балгарскага хлопца прывёў». Эдзі Агняцвет дзівіцца: «Скуль узяўся такі — / Малады і прыгожы? / Штосьці блізкае ў мове / Да нашых дуброў і палёў...» Яна бясконца шчырая ў гэтым сваім раптоўным шчасці пазнаёміцца з мясцовым Апалонам, адчуць новую эратычную эмоцыю, гэтак неабходную для сапраўднай паэтэсы. Як тут ні прыгадаць познія вершы Канстанцыі Буйло, прасякнутыя падобным спадзяваннем таемнага, жарснага рамана. Эдзі Агняцвет, праўда, робіць выгляд, што просіць у свайго мінскага «мілага» даравання і заклікае, каб ён не пускаў яе «ў падарожжа, / Каб не слухала болей / Трывожных, спакуслівых слоў!» (цытаты з вершаванага цыкла «Рэха далёкіх вандровак»). Але ж мы разумеем: забароніць «мілы» ці не такія рамантычныя вандроўкі і сустрэчы — наша гераіня ўсё роўна з вялікім спадзяваннем будзе чакаць «жэўжыка-ветру», які, узяўшы яе ў абдымкі, будзе імчаць да новых пачуццёвых прыгод.

І няхай новая сустрэча чакае не з юным балгарскім прыгажуном, а, скажам, з рызыкоўным байкерам. Так яшчэ цікавей! За два гады да знакамітага байкерскага верша Анатоля Грачанікава «Матацыклісты» («Матацыклісты шпараць па шашы. / Паветра рэжуць, як электрапілы, / У рокаце — надрыўны крык душы, / Нібыта рух высмоктвае з іх сілы») Эдзі Агняцвет піша свайго «Матацыкліста», дзе да галоўнага героя, які «Да небасхілаў нечаканых ляціць» і «...ловіць на хаду / Адценні восеньскага гаю, / Хмурынак чараду», моцна прытулілася «яго любоў. / Яна сама збірае хутка / Праменні і вятры. / Гарыць аранжавая хустка / Палоскаю зары».

Уцячы. Вырвацца хаця б на некалькі гадзін з палону сям'і. І зрабіць гэта весела, хуліганіста, спантанна — падаецца, што гэта любімы занятак гарэзлівай Эдзі Агняцвет. Няхай дамашнія крыўдуюць, злуюцца, надзімаюцца, калі не разумеюць, наколькі неабходныя паэту такія творча-выратавальныя ўцёкі.

Ставіцца лёгка да жыцця, нават калі жартаваць зусім не хочацца, нават калі на дварэ 1936 год, калі за адну ноч арыштоўваюць палову тваіх сяброў — таксама адзін са шляхоў захаваць сябе. І Эдзі Агняцвет тады гэта ўдалося. Яна адпісала ў гэты час (як і ўсе тагачасныя беларускія савецкія пісьменнікі) неабходныя рыфмоўкі пра Леніна, Сталіна, Кірава, пільных чэкістаў і ўсенародную радасць. Але, што цікава, у Агняцвет няма фанатычнага жадання «суровы прыгавор падпісаць першай», пра што марыў на пачатку 1930-х Міхась Чарот, няма ачмуральнага экстазу ад нечуваных народных перамог, які можна знайсці ў вымушаных вершах-агітках Наталлі Арсенневай (якія яна складала пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі). Эдзі Агняцвет старалася пазбягаць празмернай крыклівасці. Яе сталінска-ленінскія хваласпевы нібыта прамаўляюцца скорагаворкай, без аніякай патэтыкі і тэатральнасці. Загалоўны верш пра Леніна з дэбютнага зборніка «Маё пакаленне» (1935 г.) пачынаецца па-эстраднаму нязмушана: «Мой таварыш, / паслухаем музыку раніцы гэтай. / Сёння вецер так лёгка гуляе / па струнах сваіх...» Узнікае адчуванне, што юная Агняцвет сядзіць у рэстаранчыку, гучыць лагодны джаз, яна шэпча гэтыя словы на вуха свайму кавалеру, а ўжо праз некалькі імгненняў яны пачнуць танцаваць і забудуцца хаця б на кароткі час і пра Леніна-Сталіна, і пра трагічныя 1930-я.

У сваім апошнім прыжыццёвым зборніку «Смутак і святло» (1996 г.) наша гераіня так згадвае той час:

Як мне шкада часін патрачаных
На слуханне пустых прамоў!
О цяжкі лёс!
У дні юначыя
Не ў тых мы верылі багоў:
Віталі воплескамі шумнымі,
Не праганялі,
Не клялі,
Калі былі мы неразумнымі
І ачмурэлымі былі.

Гэтыя развагі блізкія думкам Якуба Коласа, які шкадаваў, што «культ асобы» не быў пераадолены яшчэ пры жыцці Сталіна. Каб не быць дарэшты з'едзенай страхам, Эдзі Агняцвет і даводзілася акурат ратавацца тым, каб не прапускаць у вершы вострыя пачуцці, праўдзівыя эмоцыі, хаваць сваё аблічча пад бязважка-ажурнай маскай з нейтральнай усмешкай.

Якубу Коласу, свайму духоўнаму настаўніку, Эдзі Агняцвет прысвяціла нямала твораў. Самы цікавы, пад назвай «Перажытае», змешчаны ў яе апошняй кніжцы. Мы даведваемся, што сталінскія рэпрэсіі не абмінулі і сям'ю паэтэсы. У эвакуацыі арыштавана яе маці.

Што ж, Эдзі Агняцвет цудоўна разумела Якуба Коласа. Захаплялася яго мужнасцю, спачувала любоўным няўдачам, разумела такое справядлівае права паэта быць заўсёды закаханым. Для Агняцвет Якуб Колас назаўсёды застаўся па-рыцарску рамантычным, шляхетным, здольным здзівіць, захапіць, зачараваць. І нават пасля сваёй смерці зрабіць так, што на плошчы, якая носіць яго імя, «музыка гаспадарыць», дзякуючы якой «...вам у завею снежную / ліпень празрысты прысніцца», і, што самае важнае, «...бацька Сымона-музыкі / нібы ідзе праспектам, / Спыняецца, / прыслухоўваецца / да кожнага чыстага голаса». У гэтым апошнім радку Агняцвет зрабіла дзівоснае адкрыццё: той самы глухі да мастацтва бацька, які, памятаем, выгнаў з дому сына-скрыпача, бо той не ўпільнаваў авечак, цяпер, выкліканы чароўнымі зыкамі паэзіі Коласа, бадзяецца беспрытульным прывідам па сучасным Мінску і хоча адшукаць адрынутага ім Сымонку.

У 1958 годзе, калі пачалі вяртацца рэпрэсіраваныя паэты, Эдзі Агняцвет піша кніжку для дзяцей «Госць з далёкай зямлі». Галоўнага героя, в'етнамскага слана, прывозяць на вечнае пасяленне за калючы дрот гродзенскага заапарка. Паэтэса апісвае бедную жывёлу як працавітага і заслужанага работніка, якога, вось проста таму што захацелася, без тлумачэнняў, назаўсёды адрываюць ад роднага В'етнама. Слана прывозяць у Гродна восенню, а значыць, неўзабаве яму давядзецца сутыкнуцца з нашымі халадамі. Гартаючы кнігу, маляўніча афармленую Раісай Кудрэвіч, многія рэабілітаваныя пісьменнікі маглі заўважыць у сюжэце пераклічку са сваім сумным лёсам. Для дзяцей жа падобная вершаваная казка была проста забаўнай гісторыяй пра слана.

Агняцвет умела хаваць падтэксты і асабліва не акцэнтаваць і так відавочнае. Увогуле, яе лепшыя творы нагадваюць накіды пастэллю, дзе няма чорнага колеру, а восень (любімая пара паэтэсы) не засмучае брудам і хваробамі, а радуе прыглушана-залацістымі адценнямі чырвоных, жоўтых фарбаў.

Як бачна, Эдзі Агняцвет было цяжка вывесці з раўнавагі (асабліва ў савецкі перыяд творчасці, калі яна добра ўмела стрымліваць эмоцыі). Але ёсць адзін твор, дзе праскокваюць ноткі іранічнай незадаволенасці. Гэта верш, прысвечаны Аркадзю Куляшову і Максіму Танку: «Я помню ветрагонаў маладых. / О, як шумелі гэтыя задзіры! / На паядынках жартаў агнявых / Скрыжоўваліся славесныя рапіры. / А вочы разгараліся смялей, / Калі праходзіла жанчына... /.../ Скажыце, людзі, / пэўна, гэта сон? / Мне не пазнаць насмешнікаў вясёлых. / Ну, проста дзіва! / Што за лексікон: «Мікстуры», / «працэдуры» / і «уколы»?»

Нашу гераіню засмучала, што сучасныя ёй беларускія паэты не заўсёды дбалі пра хараство паэзіі (мала хто любіў па-мастацку вытанчана апрацоўваць уласныя тэксты, а калі і нараджаліся шэдэўры, то нібы выпадкова, па-за воляю аўтара). Яшчэ больш засмучала абыякавасць большасці калег да свайго знешняга выгляду. Сама ж Эдзі Агняцвет сачыла за сабой. Заўсёды старалася выглядаць не горш за любімую актрысу Элізабэт Тэйлар. Яе кумірам у паэзіі (акрамя Якуба Коласа) як мастак і мужчына заставаўся іранічны, востры, небяспечна спантанны Гіём Апалінэр. Таму Эдзі Агняцвет так захоплена перакладала яго паэзію.

Акрамя пачуццёвасці, Апалінэр блізкі нашай паэтэсе і сваёй філасофіяй. Жыццё настолькі пачварнае, што ставіцца да яго сур'ёзна (а гэта рабіў, у прыватнасці, Якуб Колас) не выпадае. Лепшая зброя — іранічная адасобленасць, уцёкі ад пафасу:

Жанчына заплаканая каля хаты,
Эх, ох, ах!
Па пыльнай дарозе на маршы салдаты,
Эх, ох, ах!
Паблізу ад шлюза — з вудай рабочы,
Эх, ох, ах!
І ямы траншэй, як запалыя вочы,
Эх, ох, ах!
Снарады, што бухалі і разрываліся,
Эх, ох, ах!
Запалкі, што болей у рукі не браліся —
Эх, ох, ах!
Усё ва мне з часам заглухла дазвання,
Эх, ох, ах!
Усё,
апрача майго кахання!
Эх, ох, ах!

У гэтым вершы Апалінэра «Перамена», які пераклала Эдзі Агняцвет, перакананы, выяўлена ўся філасофія жыцця гераіні нашага артыкула. Трэба сябе захоўваць. Берагчы. Заўсёды заставацца пад надзейнай аховай уласнага іранічнага спакою. Але гэтак жа трэба ўмець і ў любы час, у любым узросце быць адкрытым да сапраўднага пачуцця.

Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Знайсці паразуменне з рэчаіснасцю

Сфармуляваць сутнасць існавання чалавека — справа няўдзячная. І адназначнага адказу на пытанне «Навошта ты жывеш?» не знайсці. Але якая мэта ў чалавека, які ўвогуле не імкнецца «зразумець незразумеласць» свету? Аўтары «Маладосці» — у пошуках.

Паэтэса Марыя Бадзей прадстаўляе нізку вершаў «Развяртанне», якія вылучаюцца безліччу яркіх метафар, увасабленняў, эпітэтаў і аксюмаранаў і злучаюцца між сабой так, што паўстаюць у зусім нечаканых значэннях. Творы па-мастацку выразныя і ствараюць такую неверагодную колькасць вобразаў, што, пакуль разбіраешся ў іх, няма часу шукаць сэнс. А ці ёсць ён? І ці патрэбны пры такой цікавай гульні?

Дзмітрый Шулюк з даволі змрочнымі вершамі «Зямля ў скураных шорціках» карыстаецца часцей лексічнымі паўторамі, якія надаюць тону вершаў яшчэ большую ўпэўненасць і катэгарычнасць. Ён поўнасцю пазбавіў сябе абавязку расстаўляць знакі прыпынку, але тут ужо ёсць магчымасць пашукаць ідэі твораў, якія не назавеш ціхмянымі: нейкая асаблівая разгубленасць, неверагодная адлучанасць, разбуральная трывожнасць і балючае ўспрыманне свету напаўняюць вершы Дзмітрыя Шулюка.

Больш традыцыйная па форме і сэнсавым напаўненні падборка Алёны Беланожкі «Ягадны кактэйль». Вобразы ягад і садавіны, створаныя ў вершах, ствараюць пазітыўны настрой і выклікаюць цёплыя згадкі. Кожны з твораў мае свой сюжэт, што прымушае звярнуцца да уласных успамінаў, звязаных з летам і восенню. Яны ў нечым запаралельваюцца з каханнем і адзінотай.

Апавяданні Дар'і Трайдэн, аб'яднаныя назвай «Дзеля яе адной», поўныя асэнсавання рэчаіснасці, з якой вырастае чалавек. Цікавай падаецца наступная цытата: «Выявілася, што існаванне вымагае столькіх высілкаў, і ўсе яны прыніжальныя, дробныя, хцівыя, поўныя зямнога бруду». Гэта зыходны пункт разважанняў і думак гераіні. Часам мы і самі не заўважаем, як становімся празмерна ўпэўнена-дасведчанымі. Творы маладога аўтара гучаць па-сучаснаму, а разважанні гераіні не раздражняюць.

З новымі наробкамі знаёміць Аляксей Кулакоў. Сапраўды, як і адзначана ў характарыстыцы, аўтар — летуценнік. Шукае ў жыцці рамантычнага, дзівоснага, гераічнага. Па сутнасці, аўтар у невялічкіх апавяданнях «Ветразь», «Я памру?», «Птушкі», «Злачынства», «Палоўкі» спрабуе адказаць на вечныя пытанні: што значыць для чалавека каханне? як пачаць цаніць сваё жыццё? як варта ставіцца да сябе?.. Ён прапануе простыя і немудрагелістыя варыянты гэтых пошукаў.

Рубрыка *For example* прадстаўляе твор Васіля Гігевіча «Востраў», які можна назваць аўтарскім асэнсаваннем гісторыі. У своесаблівай прадмове пад назвай «Артэфакты» аўтар тлумачыць, чаму звярнуўся менавіта да вострава Пасхі. Наведаўшы незвычайнае месца, ён атрымаў расшыфраваныя тэксты ронга-ронга, адмысловую споведзь чалавека з нявызначанага часу, якой надаў мастацкую форму. Спачатку цяжка настроіцца на патрэбны лад, бо чытач трапляе ў зусім іншую рэальнасць: далёкі закрыты свет з яго міфалагічнымі ўяўленнямі, на чале якога, трэба адзначыць, не Бог ці нейкі адмысловы Пантэон, а Першая Баба — яна знайшла ўвасабленне ў скульптуры на востраве Пасхі. У ізаляваным свеце, які з'яўляецца мадэллю гісторыі, існуе толькі два племені, варожыя між сабой. І сутнасць існавання чалавека імкнецца зразумець просты жыхар.

Яўгенія ШЫЦЬКА

У пошуках прызначэння творцы

Здаецца, мэта вераснёўскага нумара «Нёмана» — асэнсаваць, хто такі творца і навошта ён патрэбны. У часы панавання рэлігіі ці ў свеце спажывецкіх адносін, сярод палітычнай разрозненасці і шматлікіх войнаў — хто ён, мастак слова?

Над гэтым перш-наперш разважае Іван Штэйнер у трагедыі «…Між драконам і лютасцю яго». Дзеянне п'есы адбываецца ў манастыры ў дзень смерці Сімяона Полацкага. Дата і месца адзначаны ў самым пачатку, што адразу надае твору асаблівую танальнасць. На працягу дня дзеючыя асобы ў надзвычайных абставінах разважаюць пра сутнасць паэта і магчымасць ствараць і прамаўляць Слова Божае. Да таго ж аўтар уводзіць рознапалярных у меркаваннях герояў — Сільвестра (вучанік і сакратар Сімяона Полацкага, манах, паэт), стральца і афіцэра, паслушніка, іканапісца ды іншых. Твор, даволі складаны для вывучэння звычайным чытачом, адрасуецца аматарам беларускай даўніны і тым, хто цікавіцца прыродай творчасці.

Працягвае тэму існавання творца Уладзімір Арлоў з дакументальнай аповесцю «Магія артыста». Яна можа зацікавіць шырокае кола чытачоў, бо закранае не толькі літаратурнае, але і кінематаграфічнае мастацтва. Аснова аповесці — падзеі, звязаныя з гісторыяй стварэння знакавай для беларускага кінематографа кінастужкі «Уся каралеўская рацэ». Зняўшы «фільм пра фільм», адзін са стваральнікаў «Раці» Уладзімір Арлоў прадстаўляе і аповесць, поўную аўтарскіх разважанняў і ўспамінаў удзельнікаў: Льва Дурава, Расціслава Янкоўскага, Міхаіла Карпука, Элы Мілавай. Але асноўную ролю ў творы адыграў Міхаіл Казакоў. Дзякуючы творчым і сяброўскім сувязям аўтар аповесці раскрывае постаць знакавага акцёра і рэжысёра, адлюстроўваючы рэчаіснасць, якая акаляла творцу ў савецкі і постсавецкі часы.

Завяршаецца проза нумара апавяданнем «Талука» Ларысы Калужэнінай. Даволі часта сямейныя сувязі падаюцца людзям вельмі трывалымі, нават калі родзічы не сустракаюцца гадамі. Але адно здарэнне можа скрасці гэтую ілюзію. Хвароба і страта старэйшага члена сям'і — бабулі — не яднае дзвюх сясцёр, хоць іх адносіны прыязныя.

Ключавыя катэгорыі нізкі вершаў Міхася Башлакова «І лістота кружыцца залатая» (пераклад Лізаветы Давыдавай) — Бог, Айчына, Паэт. Песімістычна настроены аўтар нібы пытае: што рабіць з амаль пражытым жыццём, ці не бессэнсоўнае яно, куды дзеліся паэты, у чым іх прызначэнне перад радзімай і вышэйшай сілай? М. Башлакоў імкнецца перадаць своеасаблівы восеньскі настрой менавіта праз пакуты, горыч, няўпэўненасць, боль не толькі з-за скончанага лета, але і з-за страчаных гадоў.

Зусім іншы настрой — у Лізаветы Палеес. У надзвычай эмацыянальнай нізцы вершаў «Будзіць, растрывожваць, паліць!» адчуваецца пошук сябе як творцы. Паэтэса бачыць сваю будучыню, імкнецца нешта перамяніць, знайсці падтрымку і адшукаць выйсце. Але, як і папярэдні паэт, яна знаходзіць яго ў найвышэйшым прызначэнні, сцвярджаючы: «Я толькі перо Твое, Господи!»

Тэматычна адрозніваецца падборка Георгія Вярбіцкага «У тыя дні трывожныя…», бо гэта ўрыўкі з дзвюх паэм пра Вялікую Айчынную вайну, што пройдзена аўтарам. Чытачам «Нёмана» прапанаваны радкі памяці пра мінулае.

Парадавала нізка вершаў Анатоля Грачанікава «Я веру ў тайну абнаўлення» (пераклад Лідзіі Вазісавай), якому ў верасні споўнілася б восемдзесят гадоў. У рубрыцы «Сябрына: паэзія народаў Расіі» прадстаўлены творы Валеры Тургая («За ўсё лёсу дзякую» ў перакладзе Юрыя Шчарбакова), Адама Ахматукаева («Няпростыя шляхі» ў перакладзе Юрыя Шчарбакова), Рымы Ханінавай («Алтар вечнасці») і Зульфіі Хананавай («Жанчына-з-каменя» ў перакладзе Святланы Чураевай і Сяргея Янакі).

Яўгенія ШЫЦЬКА

Сэрца дзеяслоў рахманы

Час спыніцца і азірнуцца на пройдзены шлях, падсумаваць тое, што ўдалося, зрабіць высновы з перажытага... Гэта восень. Пранізлівая, шчымлівая, але светлая і зіхоткая, як пазалочаны сонцам бяздонны блакіт паміж залатога голля... Аўтары, якія выступілі з паэзіяй на старонках вераснёўскага полымя, настальгуюць. Лірыка Віктара Гардзея, чыя падборка «Разгуляйся, вецер!» адкрывае нумар, не азмрочвае — хоць і ёсць у ёй матывы тугі і шкадавання аб тым, чаго не вернеш, — настройвае на рамантычную хвалю і стварае ўзнёслы настрой. Мова ў паэта вельмі каларытная, гучыць нязмушана — пазнаецца сапраўдны майстар. Ён выкарыстоўвае словы, якія цяпер ужываюцца рэдка, але ствараюць адметны вясковы антураж: «...траста выбельвалася ўранкі... жніўня надта сядравай расой», «выткуць... трапкачы». Значэнне іншых слоў — «глівеў», «залаб», «загомталі», «цурыць», «нягаджай» — не ўдалося адшукаць у слоўніку, хаця з кантэксту яны зразумелыя.

Прызнаецца ў любові да бацькоўскай хаты, да малой радзімы — роднай вёскі Забродзе — Міхась Пазнякоў. А створаны ім вобраз у паэтычнай нізцы «Соль жыцця» тыповы не толькі для яго мясціны маленства — дзе заўгодна можна дзівіцца, як «Ноч наплывае вялізнаю птушкай з лясоў. / Поўня выходзіць, як тлустая кошка, з каморкі. / Следам за ёю хтось рупны і светлы пайшоў / Хутка запальваць у небе святочныя зоркі».

Арыгінальныя вобразы здолела стварыць Таццяна Лашук у невялічкай падборцы «Дзеяслоў сэрца». Кранае «несапсутасцю» адчування, шчырасцю, чысцінёй прызнанне: «А сэрца дзеяслоў рахманы / Баіцца гучных галасоў».

З творчасцю нямецкага паэта-рамантыка Адэльберта Фон Шаміса (1781—1838) і сучаснай балгарскай паэтэсы Паўліны Паўлавай знаёміць рубрыка «Галасы свету». Нямецкія народныя паданні пераставрыў па-беларуску Андрэй Касцюкевіч, а падборку вершаў з балгарскай мовы пераклала Бажэна Мацюк.

Проза, прадстаўленая ў нумары, не вызначаецца навізной тэматыкі. Адвечныя, невычэрпныя тэмы, цікавыя заўжды і ўсім — чалавечыя стасункі. Аповесць Зінаіды Дудзюк «Два жыцці знахаркі» — летапіс звычайнай беларускай сям'і з яшчэ даваенных часоў. Алесь Ветах у апавяданні «Мюзікл» даследуе няпростыя дачынні ў тэатральным калектыве: здавалася б, людзі творчых прафесій за кошт сваёй далучанасці да чагосьці боскага павінны быць вышэйшыя за звычайныя звадкі і плёткі. Дзе ж там!.. Як гавораць, «нішто чалавечае чалавеку не чужое»... Гэта слушна і для герояў астатніх празаічных твораў — А. Ветаха «Залатоўка» і апавядання Віктара Кунцэвіча «Калі хочаш, каб шанавалі».

Літаратуразнаўчыя артыкулы Таісы Грамадчанкі, Казіміра Камейшы, Алы Сакалоўскай не адкрываюць Амерыкі, не робяць сенсацыі, але дадаюць адметныя псіхалагічныя рысачкі ў партрэты Барыса Мікуліча, Анатоля Грачанікава, Уладзіміра Караткевіча. Шаржы У. Караткевіча з прыватнага збору А. Сакалоўскай на старонках часопіса публікуюцца ўпершыню. Заслугоўвае ўвагі і літаратурнае падарожжа ў Нью-Ёрк, «здзейсненае» маладым даследчыкам Ігарам Аўласенкам разам з Піменам Панчанкам.

Яна БУДОВІЧ

Жыве і жыць будзе...

Ці ўсведамляе пісьменнік, ствараючы героя, што той будзе жыць уласным жыццём, не падкантрольным нават аўтару, ды патрабаваць працягу, развіцця, далейшых прыгод? Так адбылося з Баўтрамеем Лёднікам, галоўнай дзеючай асобай пятага ўжо рамана Людмілы Рублеўскай «Авантуры Вырвіча з банды Чорнага доктара», які не адпускаў чытача на працягу трох нумароў часопіса «Полымя» (ліпень — верасень).

Майстар інтрыгі, Л. Рублеўская праводзіць полацкага алхіміка праз самыя неверагодныя выпрабаванні. Змяняюцца гістарычныя эпохі, каралі, дзяржаўныя межы, а Чорны доктар застаецца верны сабе і пакліканню: спазнаваць таямніцы Сусвету і дапамагаць людзям, не чакаючы за тое ўзнагарод. Вобраз яркі, жывы: рысы і якасці характару настолькі запамінальныя, што адчуваеш побач яго нябачную прысутнасць. А чаго каштуе лёднікаўскі гумар — змрочны, як гісторыя, і трапны, як стрэлы Амура! Мажліва, вобраз Лёдніка — гэта мужчынская частка іпастасі сутнасці самой аўтаркі? Л. Рублеўская ўклала ў яго ўласнае светаўспрыманне і светабачанне.

Твор насычаны крылатымі выразамі, трапнымі выслоўямі, слушнымі ва ўсе часы (а не толькі для характарыстыкі гістарычнай эпохі): «Уладу мае не той, у каго грошы, а той, у чыім распараджэнні царскае вуха…», «Што гераічнага ў тым, што князь хоча і ў ваду не залезці, і рыбку з'есці?», «...лезці паміж молатам і кавадлам, або Радзівіламі і каралём, не варта. Скарыстаюць і забудуцца, як на дзіравы чаравік», «...то цябе да прыступак трону падкіне, то ў сутарэнне вязніцы шпурне», «Чым больш паношаны жупан, тым зараз ганаровей: памяць продкаў беражэцца! Патрыёты праз дзедавы боты», «Традыцыі для пана заканчваліся дыяментавым гузам на шапцы».

Аўтарскі погляд на гісторыю цалкам тыповы для нашага беларускага менталітэту: няма месца ні высокаму гучнаму пафасу, ні чорнай безнадзейнасці і беспрасветнай трагедыйнасці, нягледзячы на ўвесь драматызм. Наадварот, на прыкладзе Лёдніка мы бачым: беларус здольны на ўсё, нават на немагчымае, калі ён на ўласнай зямлі, што стагоддзямі ўбірала ў сябе кроў і ахвяры войнаў, рокашаў, лютых сечаў. Выжываць — гэта якраз тое, што ў беларуса атрымліваецца найлепш.

Увагу і цікавасць чытача трымаюць небяспечныя прыгоды, у якія, сам таго не жадаючы, пастаянна трапляе Лёднік: толькі скончыліся пошукі святога рога — героі апынаюцца ў горадзе пад уладай Жалезнага Пацука. Уцяклі адтуль — доктар за кратамі ў спальні вар'яткі Тэрэзы Радзівіл, якая дзеля забавы тыцкае ў яго распаленымі ў печы прутамі... Дзеючыя асобы другога плана — гістарычныя постаці: Пане Каханку, Радзівілы, Антоній Тызенгаўз, Жан Жылібер. Некаторыя прозвішчы вельмі блізкія да сапраўдных: так, пад Багінскімі хаваюцца Агінскія. Вельмі імпануе аўтарскі прыём кожны раздзел пачынаць альбо з кароткага інтрыгоўнага апісання, якое падрыхтоўвае чытача да будучай дзеі, альбо са згадкі далёкіх рэалій, што нейкім чынам запаралельваюцца з сучаснасцю герояў. І нават адсылка ў фінале твора да санета Максіма Багдановіча (які на момант падзей яшчэ не нарадзіўся) не выклікае непаразумення: «...Залаты паўлін паспрабаваў узляцець, але дзе там — перакормленае цела, цяжэнны шыкоўны хвост, дый, можа, яшчэ і крылы падрэзаныя...

— Вось сымбаль твой, забіты краю родны, — скрозь зубы прамармытаў Лёднік пры паглядзе на няўдалы ўзлёт».

Як і кожны з чатырох папярэдніх, раман завяршаецца хэпі-эндам. Таму смела можна чытаць уражлівым асобам з тонкай душэўнай арганізацыяй — настрой не азмрочыцца, галоўны герой жыве і жыць будзе. Нават калі і захоча, аўтар ужо не зможа яго забіць...

Яна БУДОВІЧ

НЕБАСХІЛ У СЭРЦЫ

Што ёсць любоў? За што мы любім чалавека, родныя мясціны, урэшце, Айчыну? І ўвогуле ці можна прэпараваць самае светлае пачуццё, разбіваючы яго на складнікі?

Любоўю сваёй ахінаю,
Жыві! Не знікай! — заклінаю,
Бо стану і я нелюдзімы
Без любай, чароўнай радзімы.



На высокай ноце гучыць прызнанне Міхася Пазнякова ў адным з твораў, што ўвайшоў у зборнік, складзены са 100 вершаў пра малую радзіму «Зямля бацькоў, святая…» (Мінск, Мастацкая літаратура, 2018). Ілюстравана выданне маляўнічымі беларускімі краявідамі з палотнаў Аркадзя Астаповіча, Апалінара Гараўскага, Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Вячаслава Кубарава, Пятра Аляксеевіча Данеліі, Барыса Аракчэева, Меера Аксельрода і Леаніда Шчамялёва.

...У кожнага з нас ёсць мясціна, дзе мы спазнавалі свет, спачатку невялічкі: вёска, мястэчка, маленькі ці вялікі горад. І куды б ні закінуў лёс, чалавек заўжды імкнецца на радзіму — калі не назаўсёды, дык пагасцяваць. Альбо хаця б вяртаецца ў думках. Стварае ў душы «прытулак», дзе ёсць вуліца, знаёмая з маленства, родныя веснічкі, панадворак, ліпа ў палісадзе, яблыня ля акна… І «хаваецца» там ад усіх жыццёвых нягод, набіраецца сіл, ачуньвае для новых выпрабаванняў. Гэта называецца настальгія. Загадкавае пачуццё.

У выніку шматгадовых даследаванняў навукоўцы прыйшлі да высновы, што настальгія абумоўлена біяхімічнымі працэсамі. На ўзроўні падсвядомасці чалавек помніць смак вады, якую ён піў у дзяцінстве. Таму яго і цягне туды, дзе ён нарадзіўся… А ўяўленне выбудоўвае ўсё зусім па-іншаму…

Але калі ёсць біяхімія фізіялогіі, то ёсць і біяхімія душы, толькі замест хімічных рэчываў яе складнікі — не матэрыяльныя, а больш тонкія субстанцыі… Ці не пра гэта радкі Караткевіча:

Тых, хто носіць небасхіл у сэрцы,
Нельга ні уджаліць, ні забіць.

Аўтары, чые вершы ўключаны ў зборнік, геаграфічна ахопліваюць усю Беларусь: Палессе (Максім Танк, Яўгенія Янішчыц, Міхась Башлакоў), Браслаўшчына (Пятрусь Броўка), Орша (Уладзімір Караткевіч), Вушаччына (Рыгор Барадулін), Тураўшчына (Янка Сіпакоў), Нёманшчына (Мікола Маляўка), Полаччына (Навум Гальпяровіч), Забродзе (Міхась Пазнякоў), вёска Бабчын, што засталася ў зоне радыеактыўнага забруджання (Мікола Мятліцкі), Астравеччына (Станіслаў Валодзька), Зэльва (Уладзімір Мазго), Бадзені (Мікола Шабовіч), Пугачы (Віктар Шніп), Заслаўе (Дзмітрый Пятровіч), Лунінец (Аксана Спрынчан). Пранізліва і шчыра, часам з адчуваннем трагізму і горычы, часам поўныя захаплення і маладой радасці жыцця гучаць сведчанні любові да роднай зямлі. Яны ўніверсальныя, то бок адрасаваныя і нейкай канкрэтнай мясціне, і ўсёй Бацькаўшчыне.

О родны кут любові і журбы!
Я без яго
У свеце заблудзіўся.
Вярнуўся — нібы зноўку нарадзіўся,
Успомніў, як даўно я тут не быў
І ўжо на ўсё астатняе забыўся.

Лірычны герой Алеся Бадака, самотны, стомлены жыццёвымі выпрабаваннямі, ехаў на «край свету», а прыехаў… дадому. Можа быць, мелі рацыю філосафы, якія ўяўлялі жыццё ў выглядзе спіралі: чалавеку наканавана ўвесь час вяртацца туды, дзе ён быў шчаслівы? І на кожным з віткоў-вяртанняў асоба нібы абнуляецца, абнаўляючыся, напаўняецца новай энергіяй для штодзённага існавання, вырашэння надзённых праблем? І тады ёсць сілы, каб ісці далей…

Але любіць — гэта ў першую чаргу не браць, а аддаваць. Быць адказным. Таму вельмі часта не эйфарыя, а, наадварот, горкі роздум, сумненні ўладараць у душы, поўняць светаадчуванне… На жаль, ужо не ўсе вёсачкі ззяюць чысцінёй і дабрабытам — адыходзяць гаспадары…

Імкне да лесу, горбіцца гара,
Засохлі без пары старыя дзічкі.
Я толькі сын таго гаспадара,
Які згубіў яго і спрыт, і звычкі.

Я сын яго, а можа, толькі сум,
Што праз мяне глядзіць яго вачыма.
Я разам і цяжар яго нясу
У сэрцы,
У вачах
І за плячыма.

…Я ведаю, працяжнік — гэта я.
А хто далей мой сумны воз пацягне?

З'ехаўшы ў сталіцу, лірычны герой Казіміра Камейшы не знаходзіць раўнавагі. Не супакойвае той факт, што падобныя працэсы цяпер адбываюцца па ўсім свеце: людзі пакідаюць вёскі і шукаюць шчасця ў гарадах. А вёскі занепадаюць, бо не хапае маладых рук, здатных працаваць, даглядаць, парадкаваць…

Ёсць і іншыя прыклады. Калі не знаходзілі свайго месца ў жыцці і канкрэтна ў вясковым укладзе тыя нямногія, якія шукалі і вярталіся з вышэйшай адукацыяй. Незайздросныя лёсы Васіля Гадулькі ды шматлікіх іншых правінцыйных творцаў. Як трапна прыкмячае Віктар Гардзей:

Думаюць падчас пра лёс планеты,
А часцей — пра поле за сялом,
Дзе яны, мясцовыя паэты,
Пішуць вершы плугам і пяром.

Бачаць радасць, смутак заўважаюць,
Чуюць, як трашчаць мацерыкі,
І на чысты ліст пасля сцякаюць
Іх кастурбаватыя радкі.

Боль чужы адчуюць праз імгненне,
Смех дзіцячы ўціснуць у санет.
Паляць сэрцы на кастры натхнення
Без надзей на ўвагу літгазет.

Але ж надзея ёсць. 2018-ы ў нашай краіне — Год малой радзімы. Вялікі лёс складаецца з малых лёсаў гарадоў, мястэчак, вёсак. Зборнік вершаў пра любоў да малой радзімы пад прыгожай назвай «Зямля бацькоў, святая...» натхняе задумацца над тым, якой будзе наша зямля заўтра. Бо любоў — не толькі замілаванне, зачараванне прыгожым і прыемным, але і адказнасць за гэта.

Яна БУДОВІЧ

Люстэрка для героя нашага часу

Найгалоўнейшая задача мастацкай прозы — прымусіць чытача зазірнуць углыб душы, прааналізаваць свае думкі, раскласці па палічках эмоцыі. Чым больш адораны пісьменнік, тым лепш яму ўдаюцца тыповыя, універсальныя вобразы, праз якія ляжыць чытацкі шлях да самапазнання. Разважаючы больш шырока — аўтар стварае своеасаблівае люстэрка рэчаіснасці, у якім кожны можа пабачыць самога сябе без упрыгожванняў. І тут на першы план выступаюць аб'ектыўнасць і талент, з якімі пісьменнік падыходзіць да сваёй працы, ад гэтага залежыць, якое атрымаецца люстэрка: крывое альбо праўдзівае.

Вінцэсь Мудроў — адзін з тых творцаў, якія не патрабуюць адмысловага прадстаўлення. Бо кожны, хто сочыць за айчыннай літаратурай, ведае, што проза Мудрова — гэта своеасаблівы эталон якасці, яго апавяданні і аповесці вызначаюцца глыбокім пранікненнем у самыя, так бы мовіць, недаследаваныя зоны беларускай рэчаіснасці.

На прыкладзе ягонай перадапошняй па часе выдання кнігі «Забойца анёла» (Мінск, «Кнігазбор», 2017) паспрабуем разабрацца, чым жа адметны Мудроў як пісьменнік.

Кнігу складаюць творы, напісаныя на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Іх колькасць — трынаццаць, чортаў тузін, наўрад ці выпадкова абраная аўтарам лічба. Тут ёсць як і маленькія апавяданні-замалёўкі, так і вялікія навелы, якія цягнуць на аповесці.

Апавяданне «У лазні», якім адкрываецца зборнік, мае вострасацыяльную скіраванасць. У месцы, дзе кожны аказваецца ў чым маці нарадзіла, дзе размываюцца межы паміж багаццем і беднасцю, розумам і дурасцю, дзе спрадвек вядуцца размовы і вырашаюцца спрэчкі, аўтар сутыкае светапогляд маргіналізаванай большасці са светапоглядам галоўнага героя, шараговага беларускага пісьменніка. Сутыкненне выліваецца ў непрыхаваны канфлікт, які заканчваецца бойкай і ўмоўным замірэннем у фінале. Адметна, што лазневая суполка ўвогуле прымае беларускую мову галоўнага героя за ўкраінскую, а значыцца, той, хто на ёй гаворыць, рызыкуе быць залічаным у шэрагі «бандэраўцаў». Трэба адзначыць, што аўтару як нікому ўдаецца самаіронія: беларускі пісьменнік, журналіст, інтэлектуал у ягоных аповедах, як правіла, — нехлямяжы, неахайны, пітушчы, непрыстасаваны да жыцця індывідуум. Дастатко

ва працытаваць укладзеныя ў вусны іншых персанажаў характарыстыкі галоўнага героя, калі тыя апісваюць міліцыянерам удзельнікаў бойкі: «Мне яшчэ падалося, што ў яго крыху не хапае…» або: «Ды той, дурнаваты, крыкнуў штосьці па-хахляцку…».

Але калі гумарыстычная літаратура ставіць мэту праз смех выкрываць чалавечыя заганы, то ў Мудрова сатырычныя персанажы і іх учынкі — гэта сродак праз гіпертрафіраваныя ўбоства, прымітыў і фізіялагічна-непрывабныя апісанні паказаць драму чалавека, убудаванага ў сістэму, якому не стае паветра, няважна: ці то ў задушлівай атмасферы брэжнеўскага застою, ці то ў высокатэхналагічнай сучаснасці. Прычым майстэрства Мудрова як пісьменніка дасягае таго моманту, калі сціраюцца храналагічныя межы. Увогуле, для пісьменніка характэрная тэма «маленькага чалавека», зацюканага знешнімі абставінамі, накшталт гогалеўскага Башмачкіна, які прагне вырвацца з надакучлівай, цягамотнай рэчаіснасці: напрыклад, рэдактар раёнкі Макар — праз безнадзейнае галавакружнае каханне («Ведзьма»), альбо Герман, якога жонка, каб апраўдаць уласную здраду, адпраўляе ў санаторый («Курортны аповед»).

Цікавым падаецца наступнае апавяданне «Тузік і Кузік», дзе падзеі падаюцца скрозь прызму ўспрымання двух сабак, што вартуюць недабудаваную царкву. Наўрад ці Мудроў свядома паўтарае прыёмы тых жа Гаўрыіла Траяпольскага («Белы Бім Чорнае Вуха») ці Пола Остэра («Тымбукту») і тым больш ён не натхняецца оруэлаўскай «Фермай», але па ступені пранікнення ў сабачы розум, у свядомасць жывёлы ў нашай літаратуры гэты твор можна параўнаць хіба толькі з «Ільвамі» Івана Пташнікава. А эпізод, дзе выпівохі-будаўнікі вядуць тэалагічную спрэчку наконт таго, ці ёсць у сабакі душа, і атрымліваюць ад Тузіка кароткі адказ-брэх: «Ёсць!» — падаецца ці не самым натуральным і нязмушаным прыкладам магічнага рэалізму ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя.

Але аўтару ўласцівы не толькі іронія і сарказм у дачыненні да сваіх герояў. У аповесці «Палёты праз цэнтр Зямлі» і ў апавяданні «Палёт над бусліным гняздом» (невыпадковае тут і некаторае супадзенне назваў) яскрава прасочваецца лірычна-настальгічная нотка. У абодвух творах час дзеяння — шасцідзясятыя, час дзяцінства аўтара. Галоўны герой, гарадскі школьнік, слухае разам са старэйшым братам кружэлку «*The Beatles*», чытае прыгодніцкія раманы Жуля Верна і марыць праз шахту ў цэнтры зямлі даляцець ажно да Амерыкі. Ягоная апошняя мара ў рэшце рэшт здзяйсняецца, праўда, толькі ў сне-трызненні, і — о цуд! — на адваротным баку зямлі яго вітае ўлюбёная ліверпульская чацвёрка! Апавяданне настраёва працягвае аповесць, нават сябра галоўнага героя таксама завуць Мішкам, адзінае, што месца дзеяння — вёска.

А вось «Дваццаць крокаў дарогі» — наўрад ці рэальная, але цалкам верагодная гісторыя пра тое, як вясковыя хлопцы-п'янтосы выцягваюць з балотнай твані затоплены шмат дзесяцігоддзяў таму, пасля развянчання культу асобы, вялізны бюст Сталіна, спадзеючыся здаць яго на метал. Пачаты як анекдот, бліжэй да сярэдзіны расповед набывае прыкметы злавеснай, жахлівай праз сваю алегорыю прыпавесці. Крыху аптымізму надае бадай фінал: не хто іншы, як дзед аднаго з гэтых гора-прадпрымальнікаў, якія ўваскрасілі прывід тырана, бярэ ў рукі кувалду і крочыць да помніка, каб раструшчыць ненавіснага ідала.

Майстар метафары, мастацкага абагульнення, Мудроў нездарма трымае інтрыгу і прымушае нас дачытаць кнігу да канца, да апавядання, якое і дало назву ўсёй кнізе. «Не дай нам бог забіць свайго анёла» — прамаўляе адна з гераінь апавядання «Забойца анёла», і ў гэтых словах мы чуем папярэджанне і сабе, і нашчадкам. Моцны гуманістычны пасыл робіць сваю справу: пасля твораў Мудрова нельга заставацца абыякавымі і самазаспакоенымі. Бо што, як не ўсведамленне ўласнай недасканаласці, здольна скіраваць чалавека на шлях самаачышчэння і працы над сабой?

Янка ЛАЙКОЎ

Змітрок МАРОЗАЎ

Памяць трымае жывых на зямлі

Светлай памяці маці Веры Паўлаўны прысвячаецца

Мама

Мамы не стала —
Сонца патухла
Ў сэрцы маім
Назаўсёды.

***

Тук-тук, тук-тук, тук-тук...
Забіваюць цвікі ў труну.
Тук-тук, тук-тук, тук-тук...
Мне здаецца:
Забіваюць цвікі не ў труну —
Забіваюць цвікі ў маё сэрца:
«Тук-тук, тук-тук, тук-тук...»

***

Я — тут, а мама — там...
І ўсё ж я небу маці не аддам.
Мама — тут, а я — там...
Даруйце, нябёсы.

***

Мама, ты спіш
Вечным сном.
А я не магу заснуць
Ад нявыказанай віны,
Бо заўсёды казаў табе
Не тыя словы.

***

Пярэстая аблачынка
Над пакінутай хатай,
Нібы лебядзінае крыло
Спакутаванай матчынай душы,
Якая адляцела ў вечнасць...

***

Жыццё — як сон,
Прыходзіць мама ў сне:
«Сыночак, я з табой.
А як ты без мяне?»

Саракавіны

Да нябёс адляцела,
Тут няма спарыша...
На зямлі яе цела,
А на небе душа.

З дзяцінства

Іду па тоненькім мастку
Трымаю маці за руку,
Мая рука ў яе руцэ,
Наш цень гайдаецца ў рацэ...
Маленне мамы нада мной:
«Не спатыкніся, сынку мой».

***

Сее летні вечар
Зоркі над палямі.
Бачу воблік нечы
Я ў аконнай раме.
Можа, гэта маці?
Дзе ты? Анікога...
Пуста ў роднай хаце...
Ні людзей, ні Бога.

***

Ля пакінутай хаты бяроза
Нашэптвае мне словы маці:
«Як жывецца табе, мой сыночак?»
Каля хаты — матуля-Бяроза...

Смага

Завялі кветкі,
Засохлі дрэвы,
Сасмягла сэрца
Без цябе, далёкай...
Спазніўся дождж
Амаль на цэлы месяц,
Ды толькі ён
Ні ў чым не вінаваты.

***

Знаю, ты пайшла
На сваю зорку,
Ды я не ведаю,
Дзе яна знаходзіцца.
З начнога неба
Скацілася знічка
Мне на далонь
Тваёй збалелай слязінкай.

***

Калі я адгэтуль паеду,
Хто ўспомніць тады пра мяне?
Пустая бацькоўская хата?
Магілы матулі і таты?
Калі я адгэтуль паеду,
Спытайце ў бацькоў пра мяне.

***

Перачытваю пажоўклыя
Лісты ад мамы —
Вестачкі з былога:
«Накасіла сена...
Выкапала бульбу...
Ацялілася карова...
Памерла суседка...»
Перачытваю лісты ад мамы
І чакаю, чакаю вестачкі
Ад яе. Адтуль...
Хаця б у сне.

***

Пасля цябе застаўся вобраз мілы,
Які адбіўся ў маладым люстэрку,
Куды глядзець ты раніцай любіла
Прад тым, як бегчы даглядаць жывёлу,
Застаўся любы вобраз у люстэрку,
А значыць, ты, матуля, не памерла!

Спадчына

Памёр чалавек.
Што засталося
Няўдзячным нашчадкам?
Пустая хата
Ды галашэнне ветру
Ў сляпых вачніцах
Выбітых вокнаў.

***

Жыццё — нядоўгае спатканне.
З усім, што радуе, баліць.
Пражыты дзень — крок развітання...
Дайсці б да вечнасці... Дажыць!

***

Праводзяць чалавека на Галгофу,
Натоўп даўжэзны за труной пляцецца,
Апошняя ў натоўпе тым
Жанчына ў чорным саване — Яна...
Ды толькі аніхто Яе не бачыць,
Апроч мяне аднога.

***

«Хто Я?» —
Паслаў я запыт веку...
«Ніхто! Акрамя таго,
Што быў ты чалавекам».

***

Зернетка світальнай знічкі
пакацілася за небасхіл
І ўжо ніколі не вернецца
На роднае неба.
Чым яно прарасце на зямлі?
Сцяблінай? Коласам?
Чалавечай душой,
Якая некалі пакінула
Гэты свет?

Віктар ЯРАЦ

Фрэскі храмаў

На вуснах святых маўчанне
мінулых вякоў, у якіх
білі званы і начамі
ў часіны нашэсцяў злых.
Тут вольна малітвам — не цесна
вачыма гукаць далячынь,
дзе помніць забытыя песні
высокі ход аблачын...

***

За аблокі не сплываюць мамы —
у зямлю сыходзяць назаўжды,
дзе зязюлі не кукуюць пра гады
і вясёлкі не смяюцца ў маі.
Мамы хочуць нешта і з магілы
падказаць — і голас іх ідзе:
і пад глінай ён знаходзіць сілы,
і пад жвірам,
дзе ў абдымку ноч і дзень.
Мамы і з нябыту нам гатовы
паспрыяць, паспачуваць, калі
не хапае ў цэлым свеце слова,
што расло ў спагадзе-цеплыні...

***

Заўтра ў горад з рук белых фей
снегіры прыляцяць світаннем —
праз гады яшчэ чырваней
апякаць тайну гукаў маўчаннем.

***

Сонца ўставала —
і мама яму
ціха вітанне сваё пасылала,
зычыла свету — са снегам зіму,
лета за дажджамі без граду і шквалу
навалы.
Хто цяпер будзе
з ім дамаўляцца,
каб не мінала пагода касьбы,
жніўныя дні
і каб шчодрасцю брацца
снежню без гурбаў завейнай журбы?
Хто цяпер будзе
ліпеню зычыць
поўныя вёдры даспелых чарніц,
верасню ў росах не гул навальнічны —
ціньканне ветлых залётных сініц,
ранкаў з грыбамі
і духам бруснічным?

***

Прыйшла з вясны ў мой дзень асенні,
а я зусім і не чакаў.
І сонца разганяе цені
з маршчыны кожнага лістка.

І гукі з веснавых ваколіц,
дзе неба не астыла печ,
спачатку сэрца востра ўколюць,
а потым гояць — для сустрэч...

***

Душа бярозы і ў навальніцы,
і ў цемры без месяца — компаса
падкажа дарогу — не заблудзіцца
да мамінага маўчання і голасу...

***

У чаканні белай замеці на белай
чысціні паперы
знакі споведзі пакінуць ацалелай
цеплыні — і ў цеплыню зноў верыць.

***

На клавішах нябёсаў астылі промні-
пальцы,
што ўмелі музыкай агучваць кожны міг.
І аганькі, як светлякі ўсіх летніх
станцый,
губляліся...
Ці дагукацца іх?

***

На жалейках асенніх
высвіствае вецер
імя тваё сумам
аб леце...

***

Праз ноч вялі ў разбуджанае ранне
зямныя і нябесныя масты,
а позірк твой, і голас, і дыханне
аберагалі шлях ад чарнаты.
Птушыны спеў крыжыў з бярозай
светлай.
І на крутым світальным віражы
ты ратавала: чуў праз кіламетры,
праз ветры і далёкія дажджы...

Імя на крылах

Маленькі пасажырскі самалёт
гудзеў пра мёд непаспытаных вуснаў
над выдыхам бароў, дыханнем вод
шырокіх рэчак і рачулак вузкіх.

Тваё імя пагойдваў ціха так
і калыхаў яго так асцярожна
на крылах, як раскінутых руках,
над скошанай травой,
над спелым збожжам.

Палескі перавозчык-сувязны,
нябесных ліній рабацяга сціплы
пасля не раз наведаецца ў сны
зімой, дзе голас у вятроў асіплы.

Непаспытаны летам вуснаў мёд
разбудзіць ночы, вёрсты небасхілаў.
І праз гады маленькі самалёт
імя тваё пагойдвае на крылах...

***

Дзень наліваў віно, дарыў пяшчоту.
Ён адышоў — а след яго відзён.
Ён адышоў — але пакінуў ноты,
нібыта Моцарт, для наступных дзён...

***

Восень —
тканіна святла і дажджоў
у фарбах стракатых лістоты.

Восень —
развейванне міражоў,
час для пытання:
— Хто ты?

***

Дрэвам б'юць пад дых вятры з марозам —
гнуцца кроны і галлё трашчыць,
у якім схаваны яблык позні,
не сарваны
ветрам навальніц.

З барадой заснежана-сівою
заўтра гляне ранак на сады —
вартаўнік завеі неспакою —
і спытае пра чые гады?

Будзе небу сумна ці вясёла
ў колерах шафранавай зары
і каму прамень напіша словы
светлыя, як радасці дары?

Свет стары каму зноў юным стане
з выдыхам нягоркіх дзён зямных
і чые заменіць ён расстанні
на сустрэчы без хвілін нямых?

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ



ЯК Я КРАЎ ЦЫГАРЭТЫ

Апавяданне-быль

Цыгарэты я краў у свайго бацькі. Бацька выкурваў па два з паловай пачкі за дзень і, як мне здавалася, ніколі не ведаў, колькі ў яго цыгарэт засталося. Бо ў кожнай кішэні паліто, касцюма ці нагавіц ляжаў пачаты пачак. Часцей за ўсё «шманаў» па бацькавых кішэнях, калі ён прыходзіў на добрым падпітку і клаўся спаць без задніх ног. Я крадком прабіраўся да яго ў спальню, калі адтуль чуўся моцны храп, знаходзіў адзенне і абшукваў кішэні. Знаходзіў пачаты пачак «Беламору», падчэпліваў пазногцямі пяць-шэсць папярос і выцягваў. Пасля шукаў наступны пачак. І так з кожнага пачатага браў сваю даніну. Адна такая ходка забяспечвала мяне курывам на некалькі дзён.

Курыць я пачаў з гадоў чатырнаццаці, калі перайшоў у сёмы клас. Пасля летніх канікул аказалася, што з пятнаццаці аднакласнікаў, за выключэннем дваіх-траіх, амаль усе кураць. У мяне быў сябар Славік, з якім мы раслі разам і сябравалі з дзяцінства. Нашы дамы былі побач, праз Марынчын агарод. Мы нават сядзелі за адной партай і ўвогуле былі настолькі падобныя адзін да аднаго, што нас настаўнікі блыталі. Дык вось на летніх канікулах я раптам заўважыў, што Славік пачаў мяне пазбягаць. Ніяк не мог зразумець прычыну такіх паводзін. Ён пачаў сябраваць з Генькавым Васілём і Раманавым Алегам, маладзейшымі за нас на тры гады хлопцамі. Мяне гэта зачапіла: чаму ён хаваецца разам з імі ад мяне? Якія могуць быць ад мяне сакрэты? Неяк прасачыў і знайшоў іх каля старой вярбы: сядзелі і смалілі цыгарэты. Пабачыўшы мяне, паспяшалі затушыць свае бычкі і разагнаць дым, але ўжо было позна.

— А-а-а… Дык вось што вы тут робіце! Вы курыце!

Хлопцы пачалі мяне ўгаворваць, каб толькі я нікому не расказваў. Мяне пакрыўдзіла, што яны маглі падумаць, нібыта я іх здам. Ды палічылі, што самая надзейная гарантыя захавання сакрэтнасці — зрабіць так, каб і мяне ўцягнуць у кампанію курцоў. І пачалі яны мяне «акучваць»: маўляў, усе дарослыя кураць, значыць, каб адчуць сябе дарослым, мне трэба таксама паспрабаваць.

— Робіш так, — паказваў Васіль, падносячы цыгарку да рота, — і зацягваешся. Вось так. Потым выпускаеш дым. Можна яшчэ і колцамі, каб прыгожа было. А можна струменьчыкам.

Я няўмела круціў у пальцах прыпаленую цыгарэту. Дым выядаў вочы, я моцна зацягнуўся, як яны вучылі. І тут жа закашляўся. Кашляў доўга, яны ажно перапужаліся. Калі нарэшце ўдыхнуў свежае паветра, адразу крыкнуў: «Я пракаўтнуў дым!!!».

Яны дружна засмяяліся. «Нічога страшнага», — супакоілі. Маўляў, так і трэба, але больш за ўсё яны ўзрадаваліся, што і я закурыў, што цяпер ужо гарантавана нікому іх не выдам. Першая зацяжка мне вельмі не спадабалася. Але хлопцы пачалі ўгаворваць, што калі яшчэ некалькі разоў зацягнуцца, то закружыцца галава і будзе прыемна. Я паслухаўся… Некалькі разоў зацягнуўся, — кашаль болей не турбаваў, бо рабіў гэта вельмі асцярожна. І тут нехта заўважыў: «Глядзі, як ён збялеў!». У мяне адабралі цыгарэту і сказалі, што мне курыць нельга, а то яшчэ памру, а іх за мяне пасадзяць у турму. Хлопцы не на жарт спужаліся, што ім давядзецца адказваць за маю смерць, хоць і не чулі, каб ад цыгарэт нехта памёр.

Не ведаю, як, але паціху я ўцягнуўся. Спачатку хапала адной цыгарэты. Потым быў абавязковы перакур раніцай, перад школай. Затым даходзіла да трох цыгарэт у дзень.

Аднойчы праз тое курыва ледзь не пакалечыўся. Залезлі са Славікам на густую старую вярбу. Пад зялёным шатром нас ніхто не бачыць, а мы назіраем за ўсім, што творыцца ўнізе. Сядзім, сакрэтнічаем. І тут вырашылі пакурыць. Славік пачаставаў мяне «прымінай», прыпаліў ад запалкі і працягнуў у мой бок палаючы агеньчык. Я прыўзняўся, але зусім забыўся, што галінка, на якую абапіраўся нагой, зусім тонкая. Яна абламалася, і я паляцеў уніз. Грымнуўся на ляту аб нейкую тоўстую галіну, мяне і перакруціла ў паветры. Вышыня — метраў дзесяць, не меней. І я, растапырыўшы рукі, бухнуўся тварам аб зямлю. Устаў, паспрабаваў удыхнуць — не змог, дыханне перахапіла. Я прысеў. Сябар вавёркай скочыў з дрэва: «Толя, што з табою!? Што з табою?!» — пачаў лупасіць мяне кулакамі па спіне. Нарэшце я застагнаў і змог удыхнуць.

У класе дзявятым бацька ўсё ж такі вывеў мяне на чыстую ваду з маімі крадзяжамі. Неяк прыйшоў ён дадому нападпітку. І з нічога раптам пачаў са мною шчырую размову:

— Ты курыш? — спытаўся, гледзячы проста ў вочы.

У адказ я маўчаў, бо не хацелася лгаць напрамую.

— Я ведаю, што курыш. Ты думаеш, бацька п'яны прыходзіць дахаты і зусім ужо дурны? Думаеш, не ведаю, што ты ў мяне цыгарэты крадзеш? Не паспею вечарам распячатаць, а раніцай ужо трэцяй часткі няма.

Я зноў адмоўчваўся. Пры нашай размове прысутнічала маці. Бацька зноў:

— Скажы, калі будзеш курыць, то маці будзе купляць цыгарэты мне і табе.

— Якія яшчэ яму цыгарэты! — маці не на жарт узбунтавалася. — Не каб папругі даць, дык ён яшчэ кажа, каб я яму цыгарэты купляла! Ляксей, ты зусім здурэў ці што?

— А я бачу, што ён ужо будзе курыць. Крычы ці не крычы... Ужо крэпка падсеў…

…І я сапраўды здорава падсеў, моцна… На першым курсе тэхнікума на летніх канікулах, калі клеілі з маці ў хаце шпалеры, сорамна ўжо было бегаць на вуліцу папыхкаць за вуглом, і я засмаліў пры маці. А вось пры бацьку насмеліўся закурыць толькі пасля войска.

…Але тое, што збіраюся распавесці далей, было яшчэ раней, калі я напрапалую лазіў па бацькавых кішэнях і выцягваў адтуль сваю долю.

У маці была дзіўная звычка. Мая Пятроўна любіла падрамаць перад сном седзячы. Сядзіць, а галава паволі хіліцца долу… Гэта іншы раз і забаўляла, і раздражняла, і злавала, і цешыла ў залежнасці ад настрою і сітуацыі. Чаго толькі не рабіў, каб адвучыць яе ад такой шкоднай звычкі — нічога не атрымлівалася. Нават здзекаваўся са сваёй беднай маці. Падкрадзешся іншы раз, заціснеш ёй двума пальцамі нос, маці спачатку пужаецца, а пасля раздражняецца і злуецца. А я толькі смяюся: «Ідзі спаць ужо, чаго дрэмлеш!». Але нічога не дапамагала. Да позняй гадзіны гарэла святло ў хаце. Нават бацька пачаў яе дакараць.

Прыходзіш іншы раз з танцаў, тры-чатыры гадзіны ночы. Маці сядзіць на кухні каля стала і дрэмле.

— Чаго ты не спіш?

— Мне яшчэ чыгун трэба паставіць у печ.

— Дык пастаў і кладзіся.

— Ты знаеш, такая лянота на мяне напала, нічога не магу з сабою парабіць…

Стаўлю сам той чыгун з бульбаю ў печ і адпраўляю маці ў спальню. Наступным разам:

— Чаго ты зноў не спіш?

— Я яшчэ не ела.

— Дык паеш і кладзіся спаць!

Маці лічыла, што перад сном трэба абавязкова даць страўніку работу, і, не паеўшы, яна не засынала.

— Каб ты ведала: на сон есці ўрачы не рэкамендуюць, бо будуць ноччу жахі сніцца!

Але ў маці быў вельмі ўпарты характар, хоць кол на галаве чашы, а яна ўсё адно за сваё. Быццам і пачынае з чым-небудзь згаджацца, і думаеш, што нарэшце пераканаў яе, як праз нейкі час: «А ўсё ж такі…» — і зноў за ранейшае. Дзед Мікалай за такі характар называў маці «цвердалобай» і «папярэкай».

Яе дрымота іншы раз раздражняла мяне яшчэ і таму, што перашкаджала красці цыгарэты. Толькі я залезу ў бацькаву кішэню, як яна прачнецца, рушыць раптам у спальню і зловіць мяне на месцы злачынства: «А што гэта ты тут робіш?!».

Таму я заўсёды здзяйсняў экспрапрыяцыю бацькавых цыгарэт, калі і бацька, і маці ўжо моцна спалі.

Так было і тым разам. Толькі я прыступіў да сваёй «аперацыі» — намацаў пачак цыгарэт, выцягнуў колькі трэба, — як раптам нешта ўпала на падлогу. Гэта зваліўся з цвіка бацькаў фрэнч, які звычайна вісеў на вушаку. Павесіў я фрэнч на месца і раптам чую, што маці з божканнем прыўздымаецца з ложка. Я імгненна схаваўся за прыадчыненымі дзвярыма. Маці ўстала, запаліла святло і ўсё з тым жа божканнем пачала зазіраць пад ложак. Я выскачыў з-за дзвярэй і юркнуў у сваю спальню. У чым быў, нават не здымаючы чаравікаў, накрыўся ў ложку коўдраю. І ляжу сабе, стаіўся, не варухнуся, быццам даўно сплю. Сэрца ў грудзях калоціцца так, што, здаецца, вось-вось вырвецца. У наступны момант я пачуў, як заскрыпела падлога і маці падышла да майго ложка. Нахілілася да мяне, упэўнілася, што я сплю, паправіла коўдру і выйшла.

Наступным вечарам яна пачала распавядаць, што цэлую ноч ёй не спалася: здавалася, што нехта ходзіць па пакоі. Напярэдадні бацькі моцна пасварыліся, і тата ёй пагражаў, што развядзецца і з'едзе куды вочы глядзяць. І яна грэшнай справай нават падумала, ці не падсадзіў ён каго-небудзь з сякераю пад ложак, каб засекчы яе… Я ўсё слухаў і не знайшоў нічога лепшага, як сказаць ёй:

— Во! Казаў жа табе, не тапчы на ноч гледзячы, бо будуць кашмары сніцца!

Усё жыццё маці прасіла і маліла, каб я кінуў курыць. Бацьку яна таксама прасіла і, бывала, прыгаворвала: «Без пары загубіць цябе тваё курыва!» Бацька вельмі моцна кашляў. Загінуў ён у сорак шэсць гадоў у аварыі. Вылез з кабіны, прысмаліў, як звычайна на свежым паветры робяць курцы, сваю беламорыну, стаў на кола, каб зазірнуць, як там едзе яго свінства на мясакамбінат… А ззаду на вялікай хуткасці ў калгасны «газік» на поўным ходу ўрэзалася «калхіда» — бацьку ўдарыла бакавым бартом і раскраіла чэрап. Так што ў бацькавай смерці ўскосна былі вінаватыя і цыгарэты. На адзінаццаць гадоў я перажыў цяпер свайго бацьку.

І калі сем гадоў таму ў мяне выявілі рак правага лёгкага, а потым зрабілі аперацыю, я дакладна ведаў, што прычына зусім не ў тым, што я паліў цыгарэты. І калі распавёў анколагу свае назіранні і сваю гісторыю, ён цалкам пагадзіўся, што ў маім выпадку прычына дакладна не ў цыгарэтах. Але вось цяпер, жывучы з адным лёгкім і падхопліваючы чарговае запаленне або бронхіт, разумею, што цыгарэты становяцца для мяне смяртэльна небяспечнымі. І я нічога не магу з сабой зрабіць. Было, што цэлы год смактаў электронную цыгарэту, дык скажу, што без тытунёвага дыму цалкам прапаў быў мой вечны кашаль. Але праз год я зноў перайшоў на звычайны тытунь.

Чаму я распавёў тут пра ўсё гэта так падрабязна? Таму што літаральна ўчора знайшоў у сеціве наступнае: калі ў чалавека ёсць праблема, з якою ён ніяк не можа справіцца, то такі чалавек павінен знайсці іншага чалавека з гэткай жа праблемай, стаць перад Айцом Нябесным і шчыра да яго звярнуцца ў малітве-споведзі: «Госпадзе, мы не можам самі справіцца! Дапамажы нам!» — і на сем хвілін дэманы, якія жывуць у душах гэтых людзей, будуць паралізаваныя. І вось гэтыя сем хвілін і ёсць момант ісціны. Падчас шчырай малітвы Хрыстос вызваліць ад любой залежнасці, бо сам калісьці сказаў: «Калі чаго ў імя Маё папросіце ў Айца, дасць вам».

Я і напісаў сваё апавяданне дзеля таго, калі раптам знойдзецца ў Беларусі такі ж чалавек, які не можа справіцца са шкоднай звычкай, прачытае, знойдзе мяне, і мы памолімся разам. І станем вольнымі. Бо толькі Гасподзь можа даць сапраўдную свабоду.

СПАДЧЫНА ПРОДКАЎ

Гісторыя нашых родных вёсак больш багатая, чым гэта можна зразумець па знешнім выглядзе іх вуліц ці па вядомых краязнаўчых даведніках. Адсюль выйшла нямала выдатных дзеячаў розных эпох і дзяржаў. Шмат якія старонкі нашага мінулага дагэтуль увогуле замоўчваліся, як, напрыклад, жыццё заходнебеларускай вёскі ў складзе Польшчы ў міжваенныя гады. Але сёння ўзнікае шмат новых магчымасцяў адрадзіць жывую памяць і задаволіць тых, каго цікавяць тыя падзеі.

Яскравы прыклад паслядоўнай абароны сваёй сямейнай спадчыны на Смаргоншчыне — намаганні Францішка Жылкі, мінскага прадпрымальніка, ураджэнца вёскі Стаўбуцева, што ў Жодзішкаўскім сельсавеце. Гісторыя гэтага маляўнічага рэгіёна надзвычай багатая, а Жодзішкам у 1793 годзе нават было нададзена Магдэбургскае права.

Продкі Францішка Баляслававіча спакон вякоў былі звязаны з гэтым куточкам завілейскай зямлі: сведчанне — шматлікія дакументы, здабытыя ў архівах. Тут жылі, працавалі на сваёй зямлі, удзельнічалі ў тагачасным грамадскім і дзяржаўным жыцці, адсюль выязджалі на заробкі нават у Амерыку. Імкнуліся да духоўнасці і адукацыі. Сярод далёкіх сваякоў Ф. Жылкі — віленскі каталіцкі пралат Ян Курчэўскі, адзін з заснавальнікаў Віленскага навуковага таварыства ў пачатку XX ст., паплечнік гісторыка Чэслава Янкоўскага і аўтар манаграфіі «Гісторыя Віленскай дыяцэзіі». Брат яго дзядулі Фелікс Жылка ў 1930-я гады ўзначальваў Жодзішкаўскую гміну.

Гэтыя ці, можа, і іншыя факты падштурхнулі Францішка Жылку да актыўнай культурна-аднаўленчай работы ў родных мясцінах. Спачатку, у 2015 годзе, ім была адрэстаўравана старажытная капліца на жодзішкаўскіх могілках, дзе пахаваны яго бацькі. У 2016 г. ён пабудаваў новую каменную капліцу спецыяльна для жыхароў вёскі Стаўбуцева. У гэты самы час перад касцёлам Святой Тройцы ў Жодзішках на сродкі Ф. Жылкі паўстала белая мармуровая фігура Маці Божай, якая быццам вітае вернікаў перад гэтым старажытным сакральным будынкам XVI ст. Вакол кожнага адноўленага аб'екта правялі добраўпарадкаванне і пасадзілі дэкаратыўныя расліны.

Летась намаганнямі і на ўласныя сродкі Францішка Жылкі ў вёсцы Жодзішкі быў адкрыты адзіны ў рэспуб-ліцы этнаграфічны музей мукамольнай справы. Экспазіцыя створана на базе дзейнага вадзянога млына, пабудаванага яшчэ манахамі-іезуітамі ў канцы XVIII ст., а пад яго дахам сабраныя прылады для перапрацоўкі збожжа з розных эпох. Наведвальнікі могуць убачыць мукамольны працэс і ацаніць вынаходлівасць нашых дзядоў і прадзедаў, зразумець асновы ткацкага, ганчарнага і іншых рамёстваў. Набыць гэты млын у сваю ўласнасць ад мясцовага калгаса было важнай справай для Францішка Жылкі, таму што ў пачатку XX ст. млын належаў аднаму з яго продкаў. Спатрэбілася велізарная аднаўленчая работа, і цяпер млын не толькі меле муку, але і здзіўляе наведвальнікаў унікальнай экспазіцыяй у суправаджэнні аўдыягіда. Гэта сапраўдная краязнаўчая адметнасць.



Францішак Жылка каля пабудаванай ім капліцы ў в. Стаўбуцева.

Здавалася б, адноўлена шмат, чаго яшчэ чакаць?.. Вельмі багаты плён далі высілкі Францішка Жылкі. Напрыканцы парафіяльнага свята ў вішнеўскім касцёле Святога Юды Тадэвуша, што непадалёк ад Жодзішак, у прысутнасці гродзенскага біскупа Аляксандра Кашкевіча адбылася прэзентацыя выдадзенай ім кнігі пра гісторыю гэтых мясцін. Падзея нетыповая, бо не так ужо часта сустракаюцца выданні, якія прэзентуюцца ў храмах і заслугоўваюць адабрэння святароў. Кніга выдадзена тыражом 200 асобнікаў і складаецца з двух твораў — успамінаў Фелікса Жылкі, былога войта Жодзішкаўскай гміны, аб мясцовых падзеях 1914—1951 гг., і дакументальна-мастацкай аповесці «Святыняў маўклівыя цені» Анатоля Шчучкі пра гісторыю вішнеўскага касцёла і парафіі. Кніга багата аздоблена ілюстрацыямі, у тым ліку фатаграфіямі з часоў Першай сусветнай вайны і сямейнага архіва Францішка Жылкі.

Войт Фелікс Жылка быў сведкам многіх важных падзей і ў канцы жыцця напісаў падрабязныя ўспаміны пра іх. У запісах адлюстраваны галоўныя здарэнні ў сям'і, узаемаадносіны паміж суседзямі, вернікамі розных канфесій, прыстасаванне да новых улад, побыт гарадоў і мястэчак, у якіх па волі лёсу давялося апынуцца аўтару мемуараў. Ён вельмі дакладна скампанаваў інфармацыю, гістарычныя факты, задакументаваў прозвішчы і імёны людзей — жыхароў Жодзішак і ваколіц. А гэта якраз і ёсць самае цікавае, бо запаўняе белыя плямы гісторыі рэгіёна. Фелікс Жылка на першае месца ставіў праўду сваёй зямлі. Ён распавёў пра касцёл у Жодзішках, капліцу ў Дубку, прадставіў шмат звестак пра ксяндза пробашча Рамуальда Дроніча, не абмінуў увагай ксяндзоў Вінцэнта Гадлеўскага і Стэфана Запасніка.

Другі аўтар кнігі, Анатоль Шчучка, сваю мастацка-дакументальную працу прысвяціў гісторыі вішнеўскага касцёла і парафіі. Ён падае дакладныя звесткі не толькі пра дзейнасць ксяндзоў Юльяна Цімашкевіча, Пятра Война-Аранскага, Юзафа Кісяля, але і пра асоб з вядомай арыстакратычна-музычнай сям'і Сулістроўскіх і Карловічаў, уладальнікаў Вішнева на працягу XIX ст. Таму першая і другая часткі выдання супадаюць па тэме і часе. Анатоль Шчучка — таксама мясцовы ўраджэнец. Вось як ён тлумачыць прычыну цікавасці да гістарычна-рэлігійнай тэмы:

— Мясцовыя парафіяне не ведалі пра людзей, якія на самай справе ўкладалі грашовыя сродкі, ахвяравалі здароўем і часам, рызыкавалі жыццём дзеля пабудовы касцёла. Мне стала неяк крыўдна за тых, хто зрабіў годную справу, а цяпер ляжыць у крыпце храма, але ніхто не згадвае іх імёнаў. Таму вырашыў сабраць у адно цэлае даты, прозвішчы асоб, якія пакінулі след на гэтай зямлі, і распавесці пра гісторыю парафіі. Мне не хацелася падаваць звесткі ў сухой энцыклапедычнай форме, таму вырашыў крыху расфарбаваць іх мастацкай фантазіяй. У выніку атрымалася мастацка-дакументальная аповесць «Святыняў маўклівыя цені».

У найбліжэйшых планах Францішка Жылкі — увекавечыць у Мінску месца, дзе стаяла сядзіба вядомага фатографа першай паловы XX ст. Яна Булгака. Шмат іншых цікавых задумак.

Таццяна КЛЯШЧОНАК

Памяць пра Ігната Дварчаніна

Літаратурная спадчына Ігната Дварчаніна, грамадскага дзеяча, палітыка, выдаўца, беларускага паэта і літаратуразнаўца, актыўнага ўдзельніка нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, захоўваецца ў фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

На жаль, спадчына невялікая: шмат газет і часопісаў, дзе друкаваўся паэт, па розных абставінах не дайшлі да нашых дзён. Ды і жыццё пісьменніка абарвалася вельмі рана. Але яго літаратурная спадчына, як адзначыў літаратуразнаўца Арсень Ліс, дапамагае сёння арыентавацца на родны грунт, на сапраўдныя духоўныя каштоўнасці.

Жыццёвы шлях Ігната Дварчаніна звязаны з Дзятлавам, дзе ён хадзіў у школу, потым настаўнічаў, падпольна арганізоўваў беларускія курсы, драматычны гурток і беларускі хор, за што быў арыштаваны польскімі ўладамі, а створаныя ім курсы і гурткі потым разагналі. Настаўніка-бунтара адправілі ў беластоцкі канцлагер.

Грамадская і творчая дзейнасць паэта была накіравана на абарону беларускай культуры, барацьбу за адкрыццё школ на роднай мове, за свабоду дзейнасці культурна-асветніцкіх арганізацый. Падчас жыцця і вучобы ў Вільні Ігнат браў актыўны ўдзел у грамадскім беларускім адраджэнскім руху, выступаў з папулярнымі лекцыямі па гісторыі Беларусі, прапагандаваў родную літаратуру.

Пісаць пачаў у 1917 годзе. Першы верш Ігната Дварчаніна «Да беларусаў-інтэлігентаў» быў надрукаваны ў ваенна-грамадскай літаратурнай газеце «Белорусская рада». Газета выходзіла ў Мінску ў 1917—1918 гадах на рускай мове, але былі матэрыялы і на беларускай. Адзін з ранніх вершаў пад загалоўкам «Покліч» убачыў свет у газеце «Вольная Беларусь». Потым былі публікацыі ў газеце «Дзянніца», якую рэдагаваў Цішка Гартны, у альманаху «Зажынкі», у грамадска-палітычных і літаратурных газетах нацыянальна-дэмакратычнага кірунку «Гоман» і «Беларускі звон».

У Вільні Беларуская сялянска-работніцкая грамада выдавала сатырычны часопіс «Маланка». У адным з яго нумароў пад псеўданімам «І. Ладанчук» быў змешчаны верш пісьменніка «У старой Вільні». З 1927 г. Дварчанін супрацоўнічаў з часопісам «Родныя гоні», дзе надрукаваў публікацыю да дзясятых угодкаў смерці Максіма Багдановіча. У першым нумары гэтага ж часопіса змешчана яго публікацыя «Аб годзе нараджэньня Фр. Скарыны».

Калаж Маргарыты Мазоўка.

Вядомы Дварчанін і як перакладчык. У 1926 г. у друкарні «Віленскага Выдавецтва» Б. Клецкіна выйшла невялічкая кніжка — паэма А. Блока «Дванаццаць» у перакладзе на беларускую мову І. Дварчаніна (пад псеўданімам І. Гудок). У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца два асобнікі гэтага выдання.

Як літаратуразнаўца Ігнат Дварчанін найбольш поўна рэалізаваў сябе ў дзвюх працах — «Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры» і манаграфіі «Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве». Дысертацыя Дварчаніна «Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве», абароненая ў 1926 г. у сценах Карлава ўніверсітэта ў Празе, праляжала незапатрабаванай у архіве гэтай установы больш як 60 гадоў. І толькі да пяцісотых угодкаў з дня нараджэння Францішка Скарыны яна была надрукавана ў Мінску.

Сёлета гораду Дзятлаву споўнілася 520 гадоў. У верасні тут адбылася навукова-практычная канферэнцыя, арганізаваная Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі сумесна з Дзятлаўскім райвыканкамам. Прагучалі цікавыя даклады, прысвечаныя гістарычным падзеям і знакамітым людзям, у тым ліку і Ігнату Дварчаніну. Дарэчы, да 100-годдзя з дня яго нараджэння ў 1995 г. у Дзятлаве таксама прайшла гісторыка-краязнаўчая канферэнцыя. Гэтыя падзеі сведчаць пра ўшанаванне памяці знакамітых людзей Дзятлаўшчыны, якія стварылі нашу гісторыю, умацоўвалі культуру роднага краю.

Алена ДЗЕНІСЕНКА

Ініцыятывы

Этнаграфія: крок ад суполкі прыхільнікаў да індустрыі

Апошнія гады захапленне традыцыйнай культурай у беларускім грамадстве можна назваць калі не ўсеагульнай модай, то папулярным трэндам. Фальклорныя фестывалі і канцэрты рознага кшталту збіраюць усё больш гледачоў, выдаецца больш і больш музычных дыскаў (у тым ліку з падтрымкай насельніцтва), папулярнымі становяцца танцавальныя і спеўныя клубы-гурткі для моладзі і школьнікаў. Такая тэндэнцыя не можа не радаваць.

Але калі зірнуць з іншага боку, то недахоп досведу, адукацыі, звестак, наяўнасць растыражаваных памылковых тэорый могуць зрабіць працу па кансалідацыі супольнасці не тое што марнай, а нават шкоднай для захавання нашай культуры ў цэлым. Сёння распавядзём пра новыя праекты, ініцыяваныя Студэнцкім этнаграфічным таварыствам, якія скіраваныя якраз на тое, каб разрозненыя купкі аматараў аб'яднаць у супольнасць, а адукацыю ў галіне традыцыйнай культуры зрабіць больш якаснай і даступнай… з любога месца планеты.



На партале ethno.by можна бясконца вывучаць геаграфію Беларусі з дапамогай інтэрактыўных карт, дзе па кожнай з лакацый ці рэгіёнаў пазначаецца колькасць публікацый у СМІ, згадваюцца калектывы выканаўцаў і персаналіі (са спасылкамі на адпаведныя раздзелы сайта).

ETHNO.BY — АКЕНЦА Ў СВЕТ ТРАДЫЦЫЙ

Хутка споўніцца год з моманту запуску медыятэкі «Этнаўсё» — партала, мэта якога — аб'яднанне як мага большай колькасці матэрыялаў па этнаграфіі і традыцыйнай культуры беларусаў — пачынаючы з вытокаў навукі ў XIX стагоддзі і да новых публікацый нашага часу. Работа па стварэнні сайта *ethno.by*, што, па сутнасці, з'яўляецца базай даных, дзе сабраныя звесткі, факты, фота- і відэафайлы, пачалася з рашэння СЭТ упарадкаваць бібліятэку арганізацыі, а гэта больш як тысяча тэматычных выданняў. З цягам часу аказалася, што спецыяльная бібліятэчная сістэма можа выкарыстоўвацца для стварэння больш шырокіх баз дадзеных і змяшчаць не толькі тэкставую інфармацыю, але і фота, відэа, аўдыя, карты і ў цэлым дазваляе сістэматызаваць мноства звестак, за больш як паўтара стагоддзя сабраных і апрацаваных даследчыкамі.

Два гады таму праект узяў удзел у конкурсе сацыяльных праектаў *Social Weekend* і дзякуючы гэтаму атрымаў невялікую фінансавую падтрымку.

— У «індустрыі», што ўключае даследаванні традыцыйнай культуры, этнаграфіі, фальклору, задзейнічана мноства людзей. Толькі ў Мінскай вобласці сёння існуе каля 120 калектываў, так ці інакш звязаных з фальклорам, у краіне працуе прыкладна 6 тысяч культурных устаноў — дамоў культуры, рамёстваў, музеяў, ёсць профільныя навучальныя ўстановы і асобныя кафедры, што займаюцца ці спеўнай, ці музычнай традыцыяй беларусаў, — разважае кіраўнік праекта «Этнаўсё», сябар СЭТ Яўген БАРЫШНІКАЎ. — Сфера этнаграфіі аб'ядноўвае некалькі дзясяткаў тысяч людзей. Зацікаўленых у праекце становіцца яшчэ больш, калі ўлічыць аматараў беларускіх танцаў, спеваў, рамёстваў, касцюма. Партал дае неабходныя для работы звесткі, але ён можа існаваць і ў фармаце форуму і дазваляе камунікаваць у афлайне.

Сапраўды, атрымліваецца, што этнаграфічная сфера Беларусі, якая мусіць працаваць як асобная індустрыя, пакуль яшчэ не ўпарадкавана і не складзена лагічна. Гэта, напрыклад, не толькі ўжыванне тэхналогій картаграфавання, сістэматызацыі, што ўжо выкарыстоўваюцца, але і наладжванне міжасабовых сувязей унутры супольнасці. Цалкам натуральна выглядаюць форумы медыкаў, эканамістаў, але сустрэчы падобнага фармату для фалькларыстаў-этнографаў (у шырокім сэнсе) пакуль у нашай краіне не праходзілі. Так, кафедрамі, універсітэтамі праводзяцца канферэнцыі, але гэта сустрэчы для вельмі вузкага кола спецыялістаў.

— Таму форум, што мы ўжо правялі ўвесну ў межах праекта «Этнаўсё», прайшоў у фармаце абмену досведам. Кожны з удзельнікаў распавёў пра адметнасці палявой работы, складанасці, з якімі сутыкаліся і як іх пераадольвалі. Мяркуем, што падобныя сустрэчы будзем ладзіць штогод, — кажа Яўген.

Над папаўненнем медыятэкі пастаянна працуюць некалькі валанцёраў. Напрыклад, улікам журналісцкіх публікацый па тэматыцы займаецца малодшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Алена Ляшкевіч. Яна і сама многа піша пра традыцыі і фальклор беларусаў і пры планаванні чарговай экспедыцыі выкарыстоўвае «Этнаўсё»: вывучае публікацыі па пэўнай тэме і ў новых матэрыялах акцэнтуе ўвагу на яшчэ не асветленых адметнасцях, аспектах. Ёсць валанцёры, якія праслухоўваюць радыёперадачы і пазначаюць гурты і песні, што гучаць у эфіры.

— Публікацый па этнаграфіі насамрэч вельмі шмат, але многія з іх малавядомыя, — падкрэслівае Яўген. — гэта дазваляе нядобрасумленным «даследчыкам» заведама памылкова прадстаўляць свае праекты як унікальныя і зараз-ляць на ўжо адкрытых ісцінах і даследаваных тэмах. Таму наша задача — зрабіць запісы і публікацыі як мага больш даступнымі для знаёмства і вывучэння.

Так, пры папаўненні базы прыярытэт аддаецца аўтэнтычным выканаўцам і аўтэнтычнаму выкананню песень. Бо інтэрпрэтацый народных матываў, стылізацый пад фальклор мноства, таму пакуль асноўныя намаганні выканаўцаў і ўдзельнікаў праекта «Этнаўсё» скіраваныя на захаванне і пашырэнне ведаў пра існуючыя арыгінальныя запісы і фіксацыю галасоў удзельнікаў мясцовых калектываў з розных рэгіёнаў краіны.

АНЛАЙН-ШКОЛА ЯК КЛЮЧ ДА МЕДЫЯТЭКІ

Мультымедыйны партал і база даных — выдатны інструмент для вывучэння і далейшага даследавання традыцый беларусаў. Але зразумела, што, каб кожны інструмент стаўся сапраўды карысным, ім трэба ўмець карыстацца. У фальклоры часта назіраецца адваротнае: этнографамі і спецыялістамі галіны сябе называюць тыя, хто нават не мае слабага ўяўлення пра гэтую навуку.

Каб выправіць гэты недахоп і распачаць усеагульнае навучанне меркаваных даследчыкаў, некалькі гадоў таму ў СЭТ пачалі прадумваць ідэю распрацоўкі анлайн-курсаў па этнаграфіі. У краіне існуе мноства выдатных спецыялістаў галіны, якія працуюць у профільных адукацыйных установах, але не кожны ахвотны можа трапіць да іх на заняткі ці паслухаць даклад на канферэнцыі. Адкрытыя анлайн-курсы для ўсіх, што ствараюцца ў адукацыйным фармаце *Massive Open Online Courses (MOOC)*, — выдатны спосаб пераадолець адлегласці і даць магчымасць сустрэцца выкладчыку-спецыялісту і меркаванаму студэнту. Натуральна, у віртуальнай рэчаіснасці.

— *MOOC* — сёння вельмі папулярны адукацыйны кірунак. Відэаўрокі могуць існаваць як у фармаце асобных лекцый па пэўнай тэме, так і аб'ядноўвацца ў цэлыя модулі, курсы, — кажа Яўген Барышнікаў. — Наяўнасць такіх курсаў па этнаграфіі, відавочна, паспрыяе прафесійнай адукацыі аматараў этнаграфічных даследаванняў. Фармат *MOOC* прадугледжвае наяўнасць відэачасткі, дзе на працягу 7—10 хвілін выкладчык распавядае пра пэўную з'яву, а таксама інтэрактыўных тэстаў, што дазваляюць праверыць, ці здолеў слухач (глядач) засвоіць прапанаваную інфармацыю. Пасля завяршэння курса ці модуля можна будзе атрымаць электронны сертыфікат як пацвярджэнне паспяховага навучання. Дарэчы, у нашай краіне пакуль не стваралася інтэрнэт-курсаў падобнага фармату.

Дарэчы, праект анлайн-курсаў па беларускай этнаграфіі стаў адным з 12 пераможцаў конкурсу, зладжанага беларускім прадстаўніцтвам нямецкай арганізацыі *DVV International* («Вучыцца, каб дзейнічаць»). У межах курса будзе прадстаўлена 150 кароткіх урокаў, што аб'яднаюцца ў 10 курсаў ад 13 выкладчыкаў. Тэматычны дыяпазон вельмі шырокі. Гэта, напрыклад, беларускі народны строй, персанажы нашай міфалогіі, традыцыйная кухня, разьбярства, вясельная традыцыя…

Курсы будуць выкладзеныя ў вольны доступ ужо напрыканцы кастрычніка — пачатку лістапада. Але на гэтым праект не спыніцца. У арганізатараў яшчэ засталіся заяўкі на здымкі цікавых тэматычных модуляў, а самі выканаўцы — аператары, мантажоры — ужо маюць досвед па стварэнні такіх урокаў. Таму працаваць над новымі відэаўрокамі стане прасцей.

— Складана не заўважыць карысці гэтага праекта, — падсумоўвае Яўген Барышнікаў. — Відавочна, што ўрокі зацікавяць выкладчыкаў і студэнтаў завочнай формы навучання, карыстацца імі змогуць не толькі ў сталічных ВНУ, але і ў рэгіёнах. Асновы беларускай этнаграфіі змогуць вывучыць прадстаўнікі дыяспары, ды і грамадства атрымае якасны прадукт.

Адзін з наступных крокаў — пераклад лекцый на замежныя мовы (найперш англійскую) і супрацоўніцтва з бізнес-структурамі. Напрыклад, выдатнай рэкламай для прадпрыемстваў, што вырабляюць ложкі, пасцельную бялізну, стала б фінансавая падтрымка серыі лекцый пра міфалогію сну ў нашай традыцыі. Абрад «Пахаванне дзеда» зацікавіў бы бюро рытуальных паслуг, а кавярні, дзе гатуюць бліны, маглі б стаць мецэнатамі серыі лекцый пра традыцыі святкавання Масленкі ў беларусаў.

Марына ВЕСЯЛУХА

ЛЁГКІХ ШЛЯХОЎ НЕ ШУКАЎ

Уладзіміру Вялічку, які апошнім часам працаваў галоўным рэдактарам часопіса «Белая Вежа», напрыканцы кастрычніка споўнілася б 75 гадоў. Рэдакцыя «Белай Вежы» тулілася ў адным пакоі, але ў кабінеце заўсёды была сяброўская рабочая атмасфера. Аўтары, якія прыносілі матэрыялы або прыходзілі па справах у Саюз пісьменнікаў Беларусі, часта заходзілі проста павітацца ці проста пагутарыць з гэтым чалавекам…

Уладзіміру Паўлавічу пашанцавала: бацькі вучылі дзяцей не натацыямі, а асабістым прыкладам. Ды і добрых людзей у яго жыцці сустракалася нямала. Час сталення і станаўлення Валодзі выпаў на цяжкі пасляваенны перыяд. Яму пашчасціла: бацька вярнуўся з вайны ў родныя Масевічы, што на Пружаншчыне, жывы. Праўда, у калісьці вялікай вёсцы засталіся ў асноўным жанчыны, дзеці ды інваліды. Павел Вялічка быў таленавіты сталяр і цясляр. Ён ніколі не адмаўляў удовам і сіротам зрабіць калёсы, дапамагчы з рамонтам…

Агульнымі намаганнямі пераадольвалі пасляваенную разруху, будавалі хаты. Усё бясплатна. Такое бескарыслівае служэнне людзям было прыкладам з дзяцінства, гэта ўвасобілася ў характары і справах Уладзіміра Паўлавіча. Якія б высокія пасады ён ні займаў, заўсёды да людзей быў уважлівы, незалежна ад іх статусу, умеў зразумець. Наведваючы малую радзіму, памятаў многіх па імёнах і заўсёды віншаваў з прафесійным святам сваю настаўніцу.

Можна па-рознаму ацэньваць сацыялістычнае мінулае, але нельга адмаўляць тое, што кар'ера многіх будавалася згодна з талентамі і заслугамі. Па службовай лесвіцы Уладзімір Паўлавіч уздымаўся дзякуючы такім рысам характару, як адказнасць, працавітасць, інтэлігентнасць, прыстойнасць. Выдатна вучыўся і браў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці школы, у складзе студэнцкіх будатрадаў асвойваў цаліну, працаваў у брэсцкай абласной газеце «Заря» і абкаме партыі, вучыўся ў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. І нарэшце атрымаў запрашэнне першага сакратара ЦК КПБ Пятра Машэрава заняць адказную пасаду ва ўрадавым апараце.

Уладзімір Паўлавіч як памочнік Пятра Міронавіча быў блізкі яму па духу. Іх звязвала агульнасць поглядаў на развіццё рэспублікі ва ўсіх сферах, збліжала падабенства характараў і аднолькавае стаўленне да працы. Шматлікія заслужаныя ўрадавыя ўзнагароды і званні Уладзіміра Вялічкі ў журналістыцы сведчаць пра тое, што яго праца не засталася незаўважаная.

Не шукаў лёгкіх шляхоў Уладзімір Вялічка і ў пераломны перыяд пасля распаду Савецкага Саюза. Па яго ўласнай ініцыятыве на базе былога «Камуніста Беларусі» быў створаны новы часопіс — «Беларуская думка». Пра калег, якія працавалі ў той час з ім, ён не забываў, цікавіўся іх справамі, калі мог — дапамагаў.

Ніколі не адступаць перад цяжкасцямі, добрасумленна рабіць сваю справу — такія якасці моцнай асобы ў поўнай меры выявілася падчас працы Вялічкі ў часопісе «Белая Вежа». У нейкі час выданне з'яўлялася, затым знікала, потым зноў нядоўга выходзіла ў свет. Так было да таго часу, пакуль яго не ўзначаліў Уладзімір Паўлавіч. Неймавернымі высілкамі, абапіраючыся на шматлікіх сяброў, якія ведалі, паважалі яго і давалі для друку на безганарарнай аснове актуальныя матэрыялы, галоўны рэдактар узнавіў часопіс. «Белая Вежа» пачала выходзіць штомесяц і па вартасці была ацэнена ў Саюзе пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

Аднак не менш важным, а магчыма, і галоўным дасягненнем, надзейным тылам стала для Уладзіміра Паўлавіча сям'я: жонка Соф'я Іосіфаўна, з якой былі знаёмыя яшчэ са школы, і дзеці, якія заўсёды былі побач, верылі ў яго, суперажывалі ў складаныя моманты.

Пэўны час мне пашчасціла працаваць з Уладзімірам Паўлавічам, намеснікам галоўнага рэдактара. Вельмі цаніла ў ім высокі прафесіяналізм, мудрасць, вялікія душэўныя якасці. А яшчэ ён умеў дараваць. Нават тым, хто яго вельмі пакрыўдзіў.

Таццяна ЗАГВОЗДКІНА

АВАНГАРДНАЕ СВЕТАЎСПРЫМАННЕ

праз творы яркіх прадстаўнікоў некласічнага мастацтва XX стагоддзя

Ласла Хэд'ешалмі «Начное цяпло».

Авангарду як з'яве мастацтва прыкладна сто гадоў. Гэта пэўная сістэма стыляў, канцэпцый, тэорый, моў і нават школ. Зразумець гэта можна ў новай сталічнай выставачнай прасторы *Libra*: праект «Авангард. XX стагоддзе» прадстаўляе самыя гучныя імёны бунтарскага мастацтва праз іх творы.

Увазе аматараў — выстаўка больш за 50 аўтарскіх літаграфій, сярод якіх творы Васіля Кандзінскага, Сальвадора Далі, Рэнэ Магрыта, Марка Шагала, Віктара Вазарэлі і іншых яркіх прадстаўнікоў некласічнага мастацтва XX стагоддзя. Многія аўтары прадстаўлены ў Беларусі ўпершыню. Экспазіцыя складаецца з твораў, якія належаць шэрагу калекцыянераў Санкт-Пецярбурга. Арганізатары доўга падыходзілі да таго, каб паказаць такі праект у Мінску.

— Мы працягнем працаваць з піцерскімі калекцыянерамі, — гаворыць куратар праекта мастак Дзяніс Барсукоў. — У цэлым гаворка будзе ісці пра авангард. Гледачы ведаюць Далі, пазнаюць работы Магрыта, можа быць, пазнаюць творы, не ведаючы імёнаў, але ім знаёмыя сюжэты. Таму наша задача — расказаць пра гэтыя імёны, паказаць, наколькі шматграннае авангардное мастацтва, паразважаць над тым, як скандальны кірунак творчасці ператварыўся ў класіку. У выставачнай зале будуць праводзіцца лекцыі мастацтвазнаўцаў. Акрамя таго, экспазіцыю аўтарскіх літаграфій дапаўняюць інфармацыйныя стэнды, якія дазваляюць атрымаць больш поўнае ўяўленне пра творчасць майстроў.

Авангардысты адрозніваліся адзін ад аднаго не толькі тэхнікай і стылістыкай работ, але і светаўспрыманнем. Авангард у выяўленчым мастацтве можна разумець як эксперымент — з канцэпцыяй, колерам, формай. На выстаўцы прадстаўлены яркія ўзоры экспрэсіянізму, абстракцыянізму, геаметрычнага мастацтва, оп-арту, дадаізму. Так, работы паэтычнага і загадкавага бельгійскага сюррэаліста Рэнэ Магрыта хутчэй нагадваюць рэбусы. Пра адну з іх («Карт-бланш») мастак выказаўся наступным чынам: «Бачныя рэчы могуць быць нябачнымі. Калі, напрыклад, нейкія людзі едуць на кані праз лес, то спачатку бачыш іх, потым не бачыш, але ведаеш, што яны там. У карціне "Карт-бланш" вершніца засланяе сабой дрэвы, а яны засланяюць яе. Пры дапамозе жывапісу я раблю думкі бачнымі». Нацюрморты французскага жывапісца Бернара Бюфэ адрозніваюцца меланхалічным настроем і вытанчаным стылем тонкага малюнка. Творы майстра выяўленчай алхіміі Макса Эрнста супярэчылі агульнапрынятым нормам, што здольныя выклікаць у гледача шок. Абстрактныя імправізацыі Васіля Кандзінскага, яркія аптычныя ілюзіі Віктара Вазарэлі, сюррэалізм Хуана Міро… Творы гэтых аўтараў падобныя на нескладныя дзіцячыя малюнкі. Як падкрэсліваюць мастацтвазнаўцы, менавіта адсылка да дзяцінства дапамагала аўтарам развіваць свабоду мыслення. Работы Сальвадора Далі вылучае дбайная манера пісьма, дакладная перадача перспектывы, што характэрна для акадэмічнага жывапісу, аднак вобразы нерэальныя.

— Калі толькі запланавалі выстаўку, было складана зразумець, як работы такіх розных аўтараў змогуць быць арганічна прадстаўлены ў адной прасторы, — расказвае Дзяніс Барсукоў. — Але калі пачалі мантаж экспазіцыі, зразумелі, што ўсе творы — быццам пазлы: не трэба было выдумваць штосьці складанае, бо кожная карціна — асобны шэдэўр мастацтва, які можна разглядаць гадзінамі.

Выстаўка працягнецца ў Мінску да 5 снежня: ёсць час, каб убачыць творы знакамітых майстроў.

Вікторыя АСКЕРА

Рэнэ Магрыт «Карт-бланш».

Зямное і нябеснае

Натхнёныя Дзвіной мастакі прывезлі ў Полацк святло

Адкрыццё выстаўкі.

Здаўніх часоў рэкі злучалі гарады. Так і рака Заходняя Дзвіна аб'яднала 6 беларускіх мастакоў — Аляксея Краўчанку, Аляксандра Канавалава, Васіля Касцючэнку, Мацвея Басава і Мікалая Бушчыка, для якіх характэрная тэма святла, паветра, рэк і караблёў. Пра гэта сведчыць выставачны праект Рыгора Іванова «Па рацэ святла», які працуе ў мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Гэтая выстаўка асабліва важная для мастака Рыгора Іванова. Яна прысвечана 140-годдзю з дня нараджэння Казіміра Малевіча і 115-годдзю з дня нараджэння Марка Роткі, які нарадзіўся ў Дзвінску, што таксама стаіць на Дзвіне. Рака злучае гарады і мастакоў: хтосьці тут нарадзіўся, хтосьці жыве, працуе, хтосьці вучыўся, а ў кагосьці карціны вельмі блізкія да тэмы выстаўкі. Калі ў візуальным плане ёсць вобраз ракі, то ў духоўным яна становіцца сімвалам патоку святла, які льецца з тых самых часоў, калі на зямлі з'явілася жыццё.

— Я заўсёды звязаны з Дзвіной і веру, што яна можа сапраўды натхняць на цуды, — расказвае аўтар праекта беларускі мастак Рыгор Іваноў. — Від Дзвіны з берага каля Сафійскага сабора ўразіў. Гэта жывая прастора, заключаная ў гарызанталі берагоў. Адзін з вобразаў, якія паўплывалі на ўзнікненне майго аўтарскага кірунку, — святлізм. Заходняя Дзвіна, як паўнаводная светлавая артэрыя, злучае гарады і краіны, яна велічна і тонка ўваходзіць у адкрытае мора, яднаючы народы з усім светам.

Рыхтуючы праект, мастакі вельмі хацелі, каб выстаўка адбылася менавіта ў Полацку: гэты горад адметны як гістарычная сталіца беларускай культуры. Горад-музей, горад з дзіўнай духоўнай аўрай, ён неадольна прыцягвае тых, хто дыхае мастацтвам.

— Рака Дзвіна паўплывала на кожнага, увабрала ў сябе ўсё: фізічны свет, які адлюстроўваецца ад месяца або сонца, духоўны свет, які вышэйшы за фізічны, — расказвае мастак Аляксандр Канавалаў. — Сонечнае святло нясе цяпло, напаўняе навакольны свет, які мы ўспрымаем як рэчавы і радуемся яму. І падобна гэтаму нас напаўняе радасцю духоўнае азарэнне, унутранае, якое павінна быць у кожным мастаку, бо ніякі фізічны свет сам па сабе не дапаможа стварыць сапраўдны твор мастацтва. Таму я выставіў невялікія работы, эцюды: і рэалістычныя, і аддаленыя ад рэчаіснасці.

— Пад назвай «Маленькія вокны ў вялікі свет» — той свет, які мы часам не можам пакратаць рукамі, а толькі ўбачыць і адчуць.

Праз выстаўку творцы жадаюць прыцягнуць увагу жыхароў Полацка да іх прыгожай радзімы. Магчыма, святло, якім праменяцца палотны мастакоў, для кагосьці стане абуджэннем альбо своеасаблівым штуршком да дзеяння. Рыгор Іваноў час ад часу прыязджае ў Полацк і запрашае ўсіх на экскурсію па сваёй рацэ святла.

— Святло было заўсёды, як і колер, — расказвае творца. — У пачатку мінулага стагоддзя Малевіч стаў вывучаць колер, уздзеянне яго на чалавека, і з'явілася колеразнаўства, дызайн. Колер выбіраюць у залежнасці ад таго, які ён аказвае ўплыў на псіхіку. Да з'явы святла звяртаюцца многія беларускія мастакі. Я толькі пазначыў гэтае імкненне асобным словам. Калі пачуццё колеру — гэта нешта зямное, то пачуццё святла — нябеснае. У ім злучаецца і зямное, і духоўнае, як у чалавеку.

Вікторыя АСКЕРА

Творчы вектар

У музеі «Замкавы комплекс "Мір"» у межах праекта, прысвечанага разуменню ўплыву гісторыі на сучаснае мастацтва, працуе мастацкая выстаўка «*VECTOR*. Праз стагоддзі да сучаснасці».

Праект *VECTOR* — вынік супрацоўніцтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Асацыяцыі абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд».

Ключавым для ідэі праекта ўзята паняцце «вектар». Гэта метафара выбару чалавекам шляху ад пэўнага пункта адліку. У праекце маладых беларускіх творцаў такім пунктам адліку становіцца гістарычная спадчына. Невыпадкова: мастацтва з'яўляецца той сферай, дзе традыцыі раскрываюцца найбольш ярка, але яны ж здольныя стаць падмуркам для стварэння новага твора ці сэнсу.

Пра гэта разважалі больш за 20 мастакоў, што ўзялі ўдзел у праекце: студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, а таксама выпускнікі. Куратарамі праекта выступілі студэнты III курса спецыяльнасці «Мастацтвазнаўства».

Крыніцай натхнення для ўдзельнікаў праекта былі археалагічныя знаходкі і шэдэўры старажытнага мастацтва, знаёмства з якімі дазволіла на эмацыянальным узроўні адчуць повязь часоў. У жывапісных творах незвычайнага фармату, што сімвалізуе вектар, выяўляецца жыццёвы і творчы досвед, адлюстроўваюцца ўнікальныя каардынаты ўнутранага свету аўтараў.

У прасторы экспазіцыі гледачы змогуць таксама бліжэй пазнаёміцца з адным з аўтэнтычных экспанатаў Мірскага замка, паўдзельнічаць у стварэнні «новай гісторыі» з дапамогай інтэрактыўнай інсталяцыі. Работа выстаўкі будзе суправаджацца адукацыйнымі мерапрыемствамі — майстар-класамі, творчымі майстэрнямі, віктарынамі. На працягу найбліжэйшых двух месяцаў вектар вандровак паказвае на Мір.

Марыя АСІПЕНКА

Валянцін Елізар'еў: «Адзінае, чаго я прашу ў самага галоўнага творцы, — гэта час»

Легенда балета, народны артыст СССР адпрацаваў у Вялікім тэатры оперы і балета ў Мінску амаль чатыры дзясяткі гадоў, а пасля здарыўся працяглы тайм-аўт. Ужо ў якасці мастацкага кіраўніка Вялікага тэатра Беларусі Валянцін Елізар'еў сустрэўся ў Нацыянальным гістарычным музеі з прыхільнікамі творчасці, калегамі і блізкімі людзьмі, каб расказаць:

ПРА ВЯРТАННЕ

— Тэатр мае шмат складнікаў. Сцэна — лобнае месца, дзе нараджаецца мастацтва. Мае думкі менавіта пра яе, пра сцэну, пра тое, каб глядач прыходзіў у тэатр і бачыў сапраўднае мастацтва. Я прыхільнік класікі, але не адмаўляю і іншыя мастацкія формы. А калі быць дакладным, я за таленавітае мастацтва ва ўсіх формах. З гэтым вярнуўся ў тэатр пасля доўгай адсутнасці.

Балет для мяне — мастацтва душы. Ніколі не хацеў іншай прафесіі. Я пражыў доўгае і вельмі цікавае жыццё. Спадзяюся, яшчэ атрымаецца многа зрабіць для мастацтва. Адзінае, чаго я прашу ў самага галоўнага творцы, — гэта час. І пакуль у мяне ён ёсць. Я вяртаюся ў Вялікі з надзеяй — зрабіць лепш. Мне здаецца, што там цяпер не ўсё проста. Таму мяне чакае плённая і вельмі адказная праца.

Творчымі планамі падзяліцца пакуль не магу, а наконт кадраў скажу: планую прымаць на працу больш таленавітых беларускіх артыстаў. Уяўляеце, за апошнія дзевяць гадоў у тэатр оперы і балета Беларусі не ўзялі ніводнага харэографа і педагога — выпускніка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Яны перамагаюць на міжнародных конкурсах, праяўляюць сябе і з'язджаюць за мяжу. Усё-такі ствараць беларускае мастацтва павінны менавіта нашы артысты. Ведаеце, яшчэ ў XVIII стагоддзі ў Беларусі было некалькі балетных школ, моцныя традыцыі закладзены і ў савецкі час. Добры артыст павінен мець унушальную спадчыну — гэта 50 працэнтаў поспеху, іншыя 50 — у руках педагога.

Артыст заўсёды адчувае публіку: альбо яна спіць, альбо знаходзіцца ў напружанні. Калі ў зале павісае звонкая цішыня, разумееш, што працуеш дзеля гэтых магічных імгненняў. Калі пастаноўка сумная, усе намаганні марныя — гледачоў не падманеш. Мне вельмі падабаецца працаваць з моладдзю. Маладыя артысты заўсёды разумеюць, што такое кампраміс, яны гібкія і амбіцыёзныя, а гэта ў балеце, ды і не толькі, — важныя складнікі.

Планую наведаць кожны спектакль у тэатры. Мне важна ўбачыць, што цяпер адбываецца на сцэне. Любімчыкаў у мяне не будзе, як ніколі і не было. Мы павінны працаваць у камандзе, а для гэтага трэба адзін аднаго разумець.

ПРА СЫХОД

— …Быў вельмі смутны час. У Міністэрстве культуры немагчыма было знайсці паразуменне. На мае любое пытанне адказвалі: «Грошай няма». Я хадзіў па спонсарах, збіраў на нешматлікія прэм'еры грошы. Сыходзіў ад безвыходнасці, неразумення таго, што ўсё ж на мастацтва грошы трэба выдаткоўваць. Самаакупнасць немагчымая для вялікіх тэатраў — ні ў Расіі, ні на Захадзе, ні ў Азіі... Складана, калі цябе не чуюць. Я вырашыў для сябе, што не магу змагацца, — няхай пазмагаюцца іншыя. Напэўна, я здзейсніў няправільны крок — паспяшаўся звольніцца. Трэба было крыху пачакаць...

ПРА АМАТАРАЎ

— Для балета спець не трэба. Чым раней прыйдзеш на пастаноўку, тым лепш. Наколькі чалавек будзе захоплены мастацтвам, залежыць ад яго бацькоў. Калі мама з татам ведаюць дарогу ў тэатр, дзіцяці таксама спадабаюцца опера, драма, балет. Любоў да мастацтва — гэта пачуццё, якое можна і трэба выхоўваць з самага дзяцінства. Калі не ўпэўненыя, што дзіця зразумее, напрыклад, «Стварэнне свету», адвядзіце яго на дзіцячы спектакль. Але часцей за ўсё класічныя пастаноўкі не маюць узроставых абмежаванняў. Яны разлічаны на ўсіх, хто здольны адчуваць і суперажываць.

Звычайна на мае пастаноўкі прыходзіць шмат людзей. Безумоўна, гэта прыемна, але яшчэ больш прыемна тое, што людзі неабыякавыя да балета. Ім цікавы не толькі візуальны бок — яны спрабуюць паглыбіцца ў сюжэт, зразумець, што хацеў данесці рэжысёр. Мне падабаецца, калі дзеянне выклікае ў гледача пытанні. Адразу разумееш: рабіў не дарма.

ПРА СНЫ

— Кожная пастаноўка — гэта маё дзіця, у якое я ўклаў частку душы. Вылучыць адну вельмі складана. Наогул, імкнуся глядзець не ў мінулае, а ў будучыню. Тыя гады, што адсутнічаў у Вялікім, працаваў «у партфель»: запісваў ідэі, прадумваў сцэнары, шукаў тэмы… Дарэчы, мне часта сняцца харэаграфічныя сны. Напрыклад, аднойчы ноччу ўбачыў першы акт «Шчаўкунка», ледзь паспеў яго запісаць. Дарэчы, ёсць некалькі сістэм запісу танца. Зразумець канспект можа толькі аўтар, так што перадаць запіс іншаму харэографу не атрымаецца.

ПРА НАВУЧАННЕ

— Гэтыя дзевяць гадоў па-за сценамі Вялікага тэатра я не марнаваў часу дарма. Зрабіў некалькі пастановак за мяжой, выкладаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У мяне мінімум студэнтаў, я вельмі адказна адбіраю тых, з кім буду працаваць. Да ўсіх вучняў стаўлюся як да роўных. На жаль, навучанне скарацілі з пяці да гадоў чатырох. Пакуль выпускнікоў, якія скончылі навучанне па гэтай сістэме, яшчэ няма, але мы ўжо бачым, што часу дакладна не хопіць. Ведаеце, харэограф — гэта цэлы акіян, чалавек, які валодае ўнікальнай адукацыяй. Ён павінен ведаць драматургію, арыентавацца ў сусветным мастацтве, жывапісе, дызайне, архітэктуры. Я шчаслівы, калі бачу ў студэнтаў талент. Мяне радуюць іх поспехі. Напрыклад, Сяргей Мікель праявіў сябе ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры — паставіў «Вішнёвы сад» і «Тытанік». Ён не баіцца эксперыментаў, і гэта правільна: хто шукае, той знойдзе.

Разумею, што добры настаўнік — гэта заўсёды поспех. Ён накіроўвае, падтрымлівае і фарміруе. Мне калісьці пашанцавала сустрэць на сваім шляху настаўнікаў з вялікай літары. Калі я быў зусім дзіцем, са мной займаўся настаўнік з тэатра оперы і балета ў Баку. Экспрэсіўны армянін з вельмі добрай школай навучыў не проста імпульсіўна рухацца, але і ўключаць галаву, якая ў балеце важная не менш, чым астатнія часткі цела. У Ленінградзе я трапіў да Генадзя Навумавіча Сялюцкага. Гэты выдатны чалавек, сапраўдны носьбіт пецярбургскіх традыцый у балеце, уклаў у мяне любоў да танца. Калі я атрымліваў вышэйшую адукацыю на балетмайстарскім факультэце ў Ленінградскай кансерваторыі, маім настаўнікам быў Ігар Дзмітрыевіч Бельскі. Я вельмі хацеў трапіць да яго. Памятаю, на курс тады ўзялі 14 чалавек, а скончылі толькі чацвёра. Як харэографы адбыліся двое: я і Генрых Маёраў.

ПРА ГАРАДЫ

— Я нарадзіўся ў Баку. Гэта мой любімы горад, прасякнуты водарам Усходу. Ён вельмі прыгожы: размясціўся амфітэатрам на беразе Каспійскага мора. Яго марскія пейзажы — гэта дзівоснае відовішча. Горад сфарміраваў ува мне асаблівае ўспрыманне жыцця, павагу і любоў да наваколля.

У двары, дзе я рос, усе хлапчукі займаліся мастацкай самадзейнасцю. Многія хадзілі ў дзіцячую танцавальную школу. Я не стаў выключэннем. Паступіў у харэаграфічнае вучылішча ў Баку, адкуль перавёўся ў Ленінград. Гэты горад на дзевяць гадоў стаў маёй творчай калыскай. І, нарэшце, Мінск, дзе прайшла вялікая частка майго жыцця і дзе я адбыўся як мастак. Гэта мая вялікая Радзіма, якой я ганаруся, якую па-сапраўднаму люблю. Тут для мяне адбылося шмат падзей, якія сфарміравалі мяне як асобу. Заўсёды пасля выездаў за мяжу вяртаюся ў свой горад з радасцю.

Вікторыя АСКЕРА

Шматаблічнасць нацыянальнага

У Мінску стартаваў V Рэспубліканскі конкурс тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія».

На першы адборачны тур конкурсу паступіла 87 заявак, у фінал выйшлі 48 спектакляў. Гэта драматычныя, лялечныя, музычныя і эксперыментальныя пастаноўкі дзяржаўных і прыватных тэатраў з усёй краіны. Пастаноўкі ацэняць пяць адборачных камісій, у складзе якіх дзеячы культуры, рэжысёры, акцёры, драматургі, крытыкі і мастацтвазнаўцы.

— Сёлета мы пашырылі межы адбору спектакляў з пункту гледжання намінацый і ахопу творчых калектываў, якіх запрашалі да ўдзелу ў конкурсе. У гледачоў будзе магчымасць убачыць шырокую палітру тэатральнага жыцця краіны, — адзначыла першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына Дрыга. — Уведзены дзве новыя намінацыі: «Лепшы эксперыментальны тэатр» і «Лепшы тэатр драмы малой формы». Перагледзелі намінацыі для музычных тэатраў. Таксама адзначым «Лепшую работу рэжысёра» і «Лепшую работу сцэнографа». Усяго журы конкурсу вызначыць лаўрэатаў Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў 21 намінацыі.

Конкурс пачаўся з паказаў спектакляў секцыі музычных тэатраў. Тут у ліку прэтэндэнтаў на ўзнагароды — пастаноўкі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі («Багема», «Тоска», «Ор і Ора», «Каханне і смерць»), Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра («Трыстан і Ізольда», «Вясёлая ўдава», «Вішнёвы сад») і тэатра «Тэрыторыя мюзікла» («Непадалёк ад нормы», «Жарсці па Цілю»).

17 кастрычніка стартуе прэзентацыя драматычных пастановак. У конкурснай праграме тэатраў драмы прадстаўлены спектаклі вядомых рэжысёраў (Мікалая Пінігіна, Саўлюса Варнаса, Аляксандра Гарцуева, Сяргея Кавальчыка, Генадзя Мушперта, Аляксандра Яфрэмава, Якава Натапава, Наталлі Башавай, Таццяны Траяновіч), але і работы яркіх маладых рэжысёраў: Дзмітрыя Багаслаўскага, Яўгена Карняга, Аляксандра Марчанкі, Юры Дзівакова, Кацярыны Аверкавай, Рамана Падалякі і іншых.

З 9 лістапада пачнуцца паказы лялечных спектакляў. У фінал конкурсу выйшлі сем пастановак: «Пансіён *Belvedere*» (аўтар і рэжысёр Матэа Сп'яцы) і «Калядная гісторыя» (аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык Ігар Казакоў) Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, «Пліх і Плюх» Даніила Хармса (рэжысёр Юра Дзівакоў) Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек, «Сіняя-сіняя» Уладзіміра Караткевіча Магілёўскага абласнога тэатра лялек у пастаноўцы Ігара Казакова, «Новая зямля» Якуба Коласа Брэсцкага тэатра лялек у інтэрпрэтацыі Аляксандра Янушкевіча, «Сёстры Граі» Мінскага абласнога тэатра лялек «Батлейка» (рэжысёр-пастаноўшчык Яўген Карняг), «Абяцанне на досвітку» Гродзенскага абласнога тэатра лялек у пастаноўцы Чакчы Фраснокерса (Дзмітрыя Пятрова).

Апошнімі прадэманструюць эксперыментальныя пастаноўкі. У конкурснай праграме «Бетон» (аўтар і рэжысёр-пастаноўшчык Яўген Карняг) Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, «ДэкаДанс/Арыгамі» (харэограф-пастаноўшчык Вольга Скварцова) Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра, «*OEDIPUS*» (Эдып) (рэжысёр-пастаноўшчык Юра Дзівакоў) Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра, «Сёстры Граі» (аўтар і рэжысёр-пастаноўшчык Яўген Карняг) Мінскага абласнога тэатра лялек «Батлейка». На думку старшыні журы гэтай секцыі Аляксандра Гарцуева, выбраць пераможцу будзе няпроста, бо няма дакладных крытэрыяў, а ў палажэнні аб Нацыянальнай тэатральнай прэміі ўвогуле адсутнічае паняцце «эксперыментальны спектакль».

Паказы спектакляў будуць праходзіць у Мінску да сярэдзіны снежня. Закрыццё V Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» адбудзецца 21 снежня на галоўнай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Вікторыя АСКЕРА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Індустрыя. Чарговая загрузка

Вучыцца, вучыцца, вучыцца… працаваць у кінематографе

Актуальныя пытанні кінавытворчасці, прасоўвання нацыянальнага кіно ў Беларусі і за яе межамі будуць абмяркоўваць у межах XXV Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», да якога застаецца меней за месяц. Прадстаўнікі беларускай і міжнароднай кінаіндустрый сустрэнуцца, каб абмяняцца досведам і абмеркаваць падыходы да арганізацыі кінапрацэсу ў сучасных умовах. Гэтым разам галоўнай пляцоўкай мерапрыемстваў Індустрыяльнай платформы Bel:Cinema, што скіраваная на будучыню айчыннага кінематографа, стане кінастудыя «Беларусьфільм».

«Мы хочам даць зразумець, што кінастудыя адкрытая да супрацоўніцтва і падрыхтаваная да самых нечаканых яго формаў. Яна наладжвае кантакты і шукае партнёраў і сяброў. Тут вялікая гісторыя і магчымасці, а сама кінастудыя можа стаць месцам для рэалізацыі творчых ідэй», — адзначае дырэктар «Беларусьфільма» Уладзімір Карачэўскі.

Сёлета для індустрыяльнай панэлі абралі некалькі значных тэм, асэнсаванне якіх дапаможа ў клопаце пра айчыннае кіно.

1. БЕЛАРУСКАЯ КІНАДЫСТРЫБУЦЫЯ

Тое, што найбольш хвалюе нас. Але і тое, дзе можна знайсці агульныя кропкі паразумення з прадстаўнікамі іншых краін, якія таксама шукалі шляхі прасоўвання свайго нацыянальнага кінапрадукту. Разам з прадзюсарскім Цэнтрам сучаснай культуры «Чарапаха, што бяжыць» удзельнікі сустрэчы паразмаўляюць пра магчымасці кінадыстрыбуцыі. Незалежныя эксперты з-за мяжы раскажуць пра свой досвед у гэтай справе. Дыялог прыватнага і дзяржаўнага, айчыннага і замежнага кіно на тэму капрадукцыі беларускіх кінакампаній з міжнароднымі — дзе ж яго наогул весці, калі не на пляцоўцы кінастудыі «Беларусьфільм», якая на сёння застаецца тым цэнтрам, пра які можна сказаць: беларускае кіно тут.

2. ДАКУМЕНТАЛІСТЫКА: РАЗВІЦЦЁ

Від кіно, якім Беларусь можа ганарыцца. І робіць гэта: трэці раз у рамках супрацоўніцтва *B2B Doc* і ММКФ «Лістапад» дакументалісты з краін ад Балтыйскага да Чорнага мора сустрэнуцца ў Мінску на трэнінгу «*Story development workshop*».

3. АЙЧЫННАЯ АНІМАЦЫЯ

Адзін з брэндавых для нас кірункаў у кіно, які развіваецца плённа і дазваляе айчынным прафесіяналам быць запатрабаванымі ў іншых краінах. Але сапраўдныя прафесіяналы — гэта людзі, якія не губляюць магчымасцяў для самаўдасканалення і цікавяцца тым, што робіцца навокал. Чацвёртая платформа *Bel:Cinema* дазволіць кінематаграфістам узяць удзел у майстар-класе дырэктара анімацыйнага фестывалю *Tindirindis* Валентаса Аскініса і майстар-класе сцэнарыста і прафесара Чыкагскага ўніверсітэта Рональда Фальзонэ.

4. МЕНЕДЖМЕНТ У КІНО

Не менш важная тэма наогул. І для артыстаў — у прыватнасці. Індустрыяльная панэль фестывалю «Лістапад» працягвае супрацоўніцтва з беларускай актрысай Алесяй Грыбок: сёлета пройдзе прэзентацыя другога выдання яе кнігі «Менеджмент і прасоўванне кінаакцёра».

5. ПРАЕКТЫ ДЛЯ ВІРТУАЛЬНАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

У працяг мінулагодняй ініцыятывы «Дзень віртуальнай рэальнасці» сумесна са студыяй імерсіўных рашэнняў *Feeling Digital* будзе арганізаваная «*VR*-лабараторыя мастацкіх праектаў». Яе задачы — пазнаёміць з магчымасцямі стварэння гісторый у віртуальнай рэальнасці і падказаць, калі іх выкарыстанне дарэчнае і эфектыўнае. За тры дні работы каманды ўдзельнікаў прадставяць прататыпы — спробы стварэння паўнавартаснага праекта для віртуальнай рэальнасці. Але ўдзел у гэтай праграме патрабуе рэгістрацыі: падаць заяўкі можна да 20 кастрычніка.

6. ІДЭІ ФІЛЬМАЎ: ПІТЧЫНГ

Адной з найбольш важных падзей праграмы стане штогадовы пітчынг праектаў. Рэжысёры і прадзюсары, якія прайшлі адбор для ўдзелу, прадставяць свае ідэі экспертам. Спецыялісты міжнароднага рынку кіно, прадстаўнікі фестываляў і індустрый Еўропы абмяркуюць работы ўдзельнікаў і дадуць практычныя рэкамендацыі. Тыя, хто прадставяць ідэі сваіх фільмаў, змогуць пазмагацца за партнёрскія прызы і фестывальныя акрэдытацыі (гэта, між іншым, таксама значная выгода). Але для ўдзелу ў гэтай праграме таксама патрэбная заяўка, якую можна запоўніць на сайце фестывалю.

7. ВЫБУДОЎВАННЕ СТАСУНКАЎ

Bel:Cinema з'яўляецца крыніцай ідэй і спрыяе фарміраванню нацыянальнага рынку кіно і выбудоўванню сувязяў з іншымі работнікамі гэтай сферы. Разнастайнасць формаў і зместу мерапрыемстваў індустрыяльнай платформы дазваляе пабудаваць найбольш прадуктыўнае супрацоўніцтва паміж прафесіяналамі сферы кінамастацтва. Партнёрамі Індустрыяльнай платформы Bel:Cinema выступаюць кампанія *Feeling Digital*, краўдфандынгавая пляцоўка «Вулей» і мінскі Планетарый.

Заснавальнікі ММКФ «Лістапад» — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Арганізатар «Лістапада» — Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн».

«Калі стваралася індустрыяльная платформа, у нас была творчая задача зрабіць яе месцам сустрэчы беларускіх і міжнародных прафесіяналаў са свету кіно. У гэтым годзе мара зноў стане рэальнасцю: мы назіраем жывую цікавасць да прадукцыйнай камунікацыі і жаданне выбудаваць працоўны дыялог як з боку прыватных беларускіх прадзюсараў і кінастудыі «Беларусьфільм», так і з боку міжнародных кінаэкспертаў, — адзначае каардынатар індустрыяльнай платформы кінафестывалю Лізавета Бобрыкава. — Індустрыя застаецца вернай абраным кірункам: адукацыя, наладжванне стасункаў паміж беларускімі і міжнароднымі кінематаграфістамі і прасоўванне беларускага кіно».

Марыя АСІПЕНКА

САСТУПІ ДАРОГУ!

На вялікім экране ў Мінску паказалі дакументальную карціну «Дарога» Дзмітрыя Калашнікава. Фільм цалкам складзены з запісаў відэарэгістратараў, дзе работа рэжысёра, здаецца, заключаецца ў выбарцы і мантажы. Так, нехта зрабіў калекцыю відэа, склаў гэта ў нейкую адпаведную задуме чарговасць і выдаў за кіно. І паказаў, што гэта можа быць вартым кінатэатра, а не толькі канала на *YouTube*.

Праект беларускага прадзюсара Волі Чайкоўскай і расійскага рэжысёра пакатаўся па цэлым шэрагу кінафестываляў: ад расійскага «Артдокфэсту» да нідэрландскай «*IDFA*», з'ездзіў у Фінляндыю, Канаду, Польшчу, Эстонію, ЗША са слоганам «Усё, што заўгодна, можа здарыцца на расійскіх дарогах». Са слоганам і кур'ёзным кірункам, у якім паказваецца насамрэч не толькі расійская прастора, праект, здаецца, добра «зайшоў» замежнай публіцы.

З дарогі і гурта «Троіца» тут усё пачынаецца, дарогай і канчаецца. Увесь фільм складаецца з эпізодаў розных часоў, гарадоў і значэнняў, і ад кожнага ты ў выніку пачынаеш чакаць нейкага здарэння, непрадбачанага для тых, хто знаходзіцца ў аўтамабілі, і вельмі жаданага для цябе. Аварыі, жывёлы, Чалябінскі метэарыт і іншыя прыродныя катаклізмы, раз'юшаныя людзі і бойкі паказваюцца пад акампанемент каментарыяў і не даюць спыніцца. Як толькі пачынаецца новы эпізод, ты ведаеш, што кіроўца знаходзіцца ў пэўнай небяспецы, і горача жадаеш дазнацца, у чым жа яна заключаецца.

У гэтым сэнсе «Дарога» — вельмі маніпуляцыйны фільм. Мы ўсё яшчэ знаходзімся ў сферы кіно, якому ўласціва выклікаць суперажыванне, хваляванне, спачуванне, але падчас прагляду на першы план выступаюць іншыя пачуцці. Мы сапраўды чакаем новых здарэнняў і казусаў, незалежна ад таго, ці нясе гэта ў рэальным жыцці небяспеку, калецтвы і смерці. Гэта значыць, замяняем чалавечыя пачуцці на прагу новых узрушэнняў. Натуральна, перакульванні машын, стрэлы, палаючы лес задавольваюць глядацкую цікавасць і праз гэта не адпускаюць ад экрана: перастаць глядзець, што яшчэ можа здарыцца на дарогах, немагчыма. Пэўным індыкатарам тут выступаюць больш дынамічныя ўстаўкі, у якіх кароткія вытрымкі з запісаў відэарэгістратараў зманціраваны пад драйвовую ці нейкую яшчэ музыку.

Калі бачыш аварыі пад песню «Аўкцыёну», нешта ўсё ж падаецца ненармальным — ці гэта іронія над гледачом, які «з'ядае» жудаснае відовішча пад дынамічныя біты, ці шчырае жаданне паказаць дарожныя здарэнні як цалкам натуральныя інцыдэнты, бо на гэтай прасторы, маўляў, інакш быць не можа. Фокус у тым, што і глядач перастае ўспрымаць аварыі як аварыі, а глядзіць на гэта як на нейкі партрэт рэальнасці.

Што цікава, дакументальны фільм, дзе аўтар нават не прыклаў руку да здымак і распараджаўся толькі правам выбару і мантажом, часам выглядае вельмі кінематаграфічна, што толькі пацвярджае інтэграцыю законаў кіно ў рэальнае жыццё і наадварот. Тут ёсць дзіўны эпізод: машына з пасажырамі, што, канешне, актыўна каментуюць і выказваюць эмоцыі, праязджае праз палаючы лес. На краі дарогі гарыць іншая машына. Кіроўца рухаецца павольна. Такое скажэнне колераў, адчуванне сусветнай катастрофы і інтрыга не заўсёды сустракаюцца і ў ігравым кіно. Зомбі-апакаліпсіс запісалі на відэарэгістратар.

Часам сярод такога роду відэа, аказваецца, сустракаюцца сюжэтныя эпізоды. На адной вытрымцы дзяўчына кінула свае сумкі ў машыну, а кіроўца з'ехаў. Яна папрасіла ўладальніка відэарэгістратара, што стаяў за імі, паехаць за тым аўтамабілем, бо гэта таксіст. Яны дагналі таксі, забралі сумкі з дакументамі, а скончылася ўсё знаёмствам «Я Паша» — «Я Даша».

Карціна ахапіла шмат характэрных рэчаў: спосаб вырашаць канфлікты — саступаць дарогу павінен той, у каго няма молата; спосаб рамантаваць дарогі — закідваць месіва ў лужыну; спосаб пакутаваць — выбягаць басанож на дарогу перад машынай, садзіцца на капот, а потым перабягаць па яе даху. Мядзведзя на дарозе і коней з санямі, якія наехалі на аўтамабіль. Танкі і клінінг-сэрвіс для іх. Хлопца, што скраў каўбасу з машыны. Дзяўчыну, якая вучылася кіраваць і пераехала праз усю дарогу, знесла агароджы, бо пераблытала педалі.

Не менш важнай часткай фільма з'яўляецца не толькі тое, што адбываецца перад лабавым шклом, але і падзеі ўнутры аўтамабіля. Каментарыі, нецэнзурныя словы, якія ўвесь час уплятаюцца ў гаворку, «заі», упамінанне Бога, спосаб камунікаваць, манера гаварыць, цеплыня паміж сваякамі і іх духоўнае яднанне пасля катастрофы, што здарылася перад вачыма, нерухомасць, калі маладыя людзі збіваюць кіроўцу іншай машыны, — усё таксама складваецца ў пэўны калектыўны партрэт. Не кажучы ўжо пра тое, што жывыя эмоцыі становяцца важнай часткай нашага ўспрымання фільма і таго, што ён дэманструе.

«Дарога», што скарысталася запісамі відэарэгістратараў, паказала пошук новых формаў і шляхоў сучасным кінематографам і паспрабавала праз сваю ідэю адлюстраваць пэўную прастору.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

УЛАДЗІСЛАЎ ПЛІГАЎКА: «БАЯН ПАДОБНЫ НА МОРА, ЯКОЕ ЎЛІВАЕЦЦА Ў АКІЯН»

Па вялікім светлым калідоры з высокімі столямі дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 10 імя Я. А. Глебава Мінска струменіцца ўзнёслая гуллівая мелодыя… «Прэлюдыя» Баха так пасуе гэтым сценам з гісторыяй: калісьці тут быў манастыр бернардзінак. Непераўзыдзеная музыка хвалюе, будзіць уяўленне, ажыўляе эпоху. Здаецца, менавіта тут яе стыхія. Побач з гэтай музычнай школай — архітэктурным помнікам XVII ст. — дом, дзе рос Станіслаў Манюшка. Віртуозныя пералівы з тэмпераментнымі штрыхамі запавольваюць час, узрушваюць, бяруць за душу. Хто так апантана іграе? Почырк майстра? Ці старанне вучня? Хутчэй адчыніць дзверы і ўбачыць праніклівага выканаўцу!.. Знакаміты баяніст, пераможца ледзь не ўсіх сусветных музычных конкурсаў (у тым ліку «Кубка свету» ў Глазга) Уладзіслаў Плігаўка разам са сваім вучнем Алегам Суднікам развучваюць новую праграму. Трапіць на ўрок да віртуоза — вялікая ўдача. Як праходзяць заняткі ў майстра Плігаўкі, які скарыў музычны Алімп? Чым жыве музыкант з сусветным імем, што пабываў з сольнымі канцэртамі больш як у 20 краінах? Пра гэта — наша размова з Уладзіславам.

— З чым бы вы параўналі баян? Які ён для вас?

— Глядзіце: ёсць азёры, рэкі, мора і акіян. Сярод музычных інструментаў таксама можна прасачыць своеасаблівую градацыю. Ёсць інструменты самастойныя і менш самастойныя. З акіянам я б параўнаў арган — самы магутны інструмент: як і акіян, ён мае незвычайную сілу. Баян жа, на мой погляд, знаходзіцца блізка да аргана. Думаю, ён — як мора: мора, якое ўліваецца ў акіян. *(Усклікае.)*

Увогуле, баян можа ўвасобіць усе з'явы прыроды. Ёсць спецыяльны клапан для сціскання паветра: калі ім карыстацца ўмела, можна праілюстраваць, напрыклад, шум ветру. Вясёлку, дарэчы, атрымаецца паказаць з дапамогай рэгістраў, а яшчэ — прадэманстраваць пералівы, разнастайныя адценні. Цяпер увогуле ў сучасных кампазіцыях выкарыстоўваюць розныя знаходкі, у тым ліку прыёмы меха і ўдараў па інструменце, па розных частках корпуса — атрымліваецца патрэбны гук.

— Хтосьці з класікаў казаў, што музыка — гэта паэзія паветра…

— Ужо даўно таксама сказалі, што музыка пачынаецца там, дзе заканчваюцца словы...

— Якімі якасцямі павінен валодаць сучасны музыка, каб быць запатрабаваным?

— Трэба мець цікавы рэпертуар. Умець і імкнуцца іграць у разнастайных ансамблях, добра валодаць інструментам і ісці ў нагу з часам. Многія выканаўцы заседжваюцца на пэўным рэпертуары, які ім прывілі з дзяцінства, і не хочуць адыходзіць убок і граць штосьці новае. Таму трэба развівацца і пастаянна быць у курсе навінак.

— Вы неаднойчы ўдзельнічалі ў міжнародных канцэртах. Хто быў для вас узорам?

— Я вырас на творчасці Аляксандра Склярава, Юрыя Сідарава, Юрыя Вастрэлава, Фрыдрыха Ліпса, Вячаслава Сямёнава — усе карыфеі баяннага мастацтва. У працэсе творчага развіцця мне пашчасціла з імі сустракацца, мець зносіны на конкурсах. Цяпер мы разам у журы. Дзеляцца каштоўнымі парадамі, у прыватнасці па транскрыпцыі пэўных твораў: як лепш сыграць, як яны бачаць гэтую п'есу, якіясьці перадавыя моманты, каб п'еса лепш гучала. Вячаслаў Сямёнаў — не толькі выкладчык, але і выканаўца, і кампазітар. У яго надзвычай карысныя пажаданні і заўвагі. Фрыдрых Ліпс — выдатны метадыст, падказвае нейкія моманты метадычныя і агульныя. Цікава, як ён бачыць развіццё баяна ў будучыні: прагназуе поспех на акадэмічнай сцэне, прапагандуе сучасную музыку. Многія кампазітары сталі пісаць п'есы менавіта для баяна дзякуючы яму. Вячаслаў Сямёнаў жа бачыць баян у арыгінальным жанры. У кожнага, такім чынам, свае погляды. Калі сустракаемся, актывізуецца сваё бачанне.

— Кім натхняецеся: класікамі ці сучаснікамі?

— Вельмі люблю слухаць і іграць музыку Іагана Себасцьяна Баха і Вольфганга Амадэя Моцарта. З сучасных падабаецца польскі кампазітар Мікалай Майкусяк, Ян Майсл (Чэхія), Давор Бобіч (Харватыя). Цікавая музыка для баяна ў беларускіх кампазітараў, у прыватнасці Уладзіміра Каральчука, Паўла Дзенісенкі, Леаніда Маліноўскага, Віктара Малых, Аляксандра Пажарыцкага, Уладзіміра Грушэўскага і іншых. Заўсёды ўключаю ў сваю праграму музыку беларускіх кампазітараў ці апрацоўкі беларускіх народных мелодый. Гэта любяць за мяжой і ўспрымаюць на «ўра».

Фота з архіва Уладзіслава Плігаўкі.

Уладзіслаў Плігаўка.

— Ці дапамагае яно ў працы выкладчыка?

— Цяпер я працую ва ўсіх звёнах музычнай адукацыі: у музычнай школе, музычным каледжы, акадэміі, перадаю досвед новаму пакаленню. Ёсць вынікі. Мой вучань, 18-гадовы Дзяніс Угорцын, навучэнец 3 курса Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, стаў пераможцам конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І. І. Жыновіча: выйграў Гран-пры. Таксама ён паспеў узбагаціць сваю скарбонку перамогай яшчэ на двух значных спаборніцтвах: 1 прэмія на міжнародным конкурсе джазавай і эстраднай музыкі «*Jazz-time* 2018» і 1 прэмія на III Міждународным конкурсе юных музыкантаў «Палескі агеньчык» у Драгічыне. А 13-гадовы Алег Суднік, з якім займаемся тут, у дзіцячай музычнай школе мастацтваў № 10 імя Я. А. Глебава, выйграў ужо 6 конкурсаў, і не толькі рэспубліканскіх, але і міжнародных.

— Ці разумеюць вучні, што, каб дасягнуць поспеху, трэба займацца па 7 гадзін?

— Сённяшняе пакаленне хоча, каб атрымлівалася ўсё і адразу — імгненны поспех. Але так не бывае. Можна дасягнуць добрых вынікаў, калі займацца правільна, кантраляваць свае заняткі і выконваць усе рэкамендацыі педагога. Але самакантроль — складаная штука. Гэта прыходзіць з вопытам, выпрацоўваецца часам. Таму калі гаварыць пра юных музыкантаў, то найлепшы вынік, як правіла, бывае, калі заняткі дзіцяці кантралюе педагог або бацькі (добра, калі яны таксама музыканты). Тое ж самае можна сказаць і пра навучэнцаў каледжаў.

— А вось Рыхард Вагнер прыдумаў незвычайны спосаб саманавучання: перапісваў партытуры сімфоній Людвіга ван Бетховена…

— Настаўнік робіць складанае лёгкім. Па сутнасці, рэпетытар кантралюе правільнае выкананне дамашніх заняткаў, адначасова тлумачачы складаныя моманты ці паўторна замацоўваючы дрэнна засвоены матэрыял. Рэдкі вучань можа запомніць усё, што сказаў настаўнік на ўроку. І дамашнія заняткі праходзяць у большасці выпадкаў механічна, так, як гэта зручна вучню. Таму прынцып рэпетытарства ў музыцы такі ж, як і ў астатніх прадметах, толькі музыкантам гэта яшчэ больш неабходна, асабліва калі патрэбна дамагчыся высокіх вынікаў.

— А вы ставіце складаныя задачы? Вядомы расійскі баяніст-педагог Вячаслаў Сямёнаў прымушаў сваіх вучняў іграць архіскладаныя «Вечны рух» Нікола Паганіні, «Італьянскую польку» Сяргея Рахманінава… Што іграеце?

— Зразумела, ёсць пэўныя тэхнічна складаныя творы, якія павінен сыграць кожны музыкант. Тыя ж капрысы Паганіні, творы Ліста і г. д. Такія п'есы з мастацкага пункту гледжання іграць нашмат цікавей, чым проста эцюды. І, трэба сказаць, гэтыя тэхнічна складаныя п'есы адразу не атрымаецца сыграць якасна, ім патрэбны час. Таму я часта практыкую даваць такія складаныя п'есы як бы загадзя, «навыраст». І такім чынам вырашаецца адразу некалькі задач: павышаецца тэхнічнае майстэрства і рыхтуецца новы рэпертуар.

Часта гастралюю сумесна з вучнямі: так яны адчуваюць сябе намнога больш упэўнена, асабліва пасля вялікага перапынку паміж выхадам на сцэну ці калі рыхтуем новую праграму. Неаднаразова быў на цудоўным фестывалі народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах.

— Цяпер на конкурсах вы ў якасці члена журы. Што новага ў баяннай тэхніцы паказваюць выканаўцы? Чым адрозніваецца тэхніка ігры замежнікаў?

— Сёння баянная тэхніка дасягнула неймаверна высокага ўзроўню. Тое, што раней іграліі дарослыя філарманічныя выканаўцы, цяпер з лёгкасцю выконваюць юнакі і дзеці. Ды так, што часам забываешся, што ты на конкурсе. Настолькі гэта высокамастацкае выкананне! І калі раней лідзіруючыя пазіцыі займалі музыканты з постсавецкіх краін, то цяпер такіх межаў не існуе. Заўважна гэта і на майстар-класах. Сёлета ў мяне быў майстар-клас у Польшчы ў музычнай акадэміі г. Катавіцэ, у Чэхіі ў горадзе Астрава, у Гомелі ў рамках конкурсу «Мой сябра — баян». Майстар-класы арганізоўваюцца заўсёды, калі ўдзельнічаю ў журы конкурсу ці выязджаю з канцэртамі. Выкладчыкі і студэнты просяць з імі пазаймацца.

— Ці адчувальны плён? Кажуць, вучань — гэта не ёмістасць, якую трэба напоўніць, а факел, які трэба запаліць…

— Так. Кожны чалавек індывідуальны. І калі слухаеш яго, бывае, дастаткова толькі накіраваць: бачыш, што ён ідзе не зусім правільным курсам, і за кароткі час (пакуль доўжыцца майстар-клас) трэба дакладна паставіць мэту і скіраваць, каб хутка дасягнуць жаданага выніку. Усё можна развіць да пэўнага ўзроўню. Але калі талент ёсць, вынік з'явіцца намнога хутчэй. Ды потым усё роўна будзе чуваць: узровень дасягнуты шматлікімі трэніроўкамі-дрэсіроўкамі ці гэта адбываецца натуральна і свабодна.

— Талент юных Моцартаў імкнуцца разгледзець у раннія гады. Але некаторыя лічаць, што, калі маленькіх музыкаў нагружаць заняткамі па максімуме, іх пазбаўляюць дзяцінства…

— Дзеці, якія вучацца ў музычнай школе і атрымліваюць музычную адукацыю, больш развітыя. У музыкаў працуюць два паўшар'і, бо, іграючы на музычным інструменце, сумяшчаюцца адразу некалькі працэсаў. У іх усё адбываецца больш планамерна. Музыка, увогуле, — адмысловы працэс, у якім задзейнічаны ўвесь арганізм. Гэта своеасаблівая арыфметыка, прытым больш складаная і карысная, чым ментальная, якая сёння так папулярная. Але галоўнае якраз у тым, што музыка — гэта арыфметыка з душой. Таму так важна вучыць дзяцей музыцы.

— Калі б не музыка, чым бы займаліся? Фрыдэрык Шапэн, дарэчы, мог стаць пісьменнікам (яго лісты да родных, напісаныя ў хлапечым узросце, уражваюць дасціпнасцю)… А ў Аляксандра Барадзіна доўгі час галоўнай справай была хімія…

— Хутчэй за ўсё, выбраў бы спорт. Музыка ў нейкай ступені — спорт: тыя ж штодзённыя трэніроўкі-рэпетыцыі, вялікая праца, адказныя выступленні і г. д.

— Ваша жонка Аляксандра Фёдарава таксама музыкант. У вас ёсць творчыя дуэты? А ваша маленькая дачушка музіцыруе?

— Так. Ёй 4 гады. Ужо іграе і на баяне, і на акардэоне. Будзем імкнуцца, каб яна атрымала музычную адукацыю. З жонкай іграем разам. Сёлета яна выступала са сваёй калегай на многіх канцэртах у музычнай школе і іншых канцэртных пляцоўках. Хачу адзначыць, што ў дзіцячай музычнай школе № 2 імя М. І. Аладава, дзе яна працуе, вельмі творчая атмасфера. Таму, магчыма, хутка з'явіцца трыа?!

Наталля СВЯТЛОВА

Сілуэты Спадчыны

Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі

ВІШНЕВА



Царква ў гонар Святых Касмы і Даміяна.

Былое мястэчка Вішнева, што раскінулася непадалёк ад Валожына, захапляла заўсёды. З самага пачатку нашага знаёмства яно быццам наўмысна дзялілася сакрэтамі і паказвала архітэктурныя скарбы, ды паступова, неадразу. З цягам часу гэта ператварылася ў забаўляльную і крыху загадкавую гульню. Наведваючы Вішнева зноў, адкрываю нешта новае. І ўпэўніваюся: сустрэча гэтая не апошняя.

Паселішча вядома ажно з сярэдзіны XIV стагоддзя. Да канца XVII стагоддзя — маёмасць шляхецкіх радоў Гальшанскіх і Пацаў. З 1600 года і на працягу наступных трох стагоддзяў тут гаспадарыў род Храптовічаў. На сродкі навагрудскага ваяводы Юрыя Храптовіча ў 1637 годзе быў пабудаваны велічны цагляны каталіцкі храм у гонар Пані Марыі ў стылі барока. Стаіць касцёл на месцы старажытнага капішча, драўлянай святыні, узведзенай у 1424 годзе вялікім князем літоўскім Вітаўтам. Пасля пажару, які адбыўся ў храме ў 1771-м, да яго дабудавалі бакавыя капліцы, а ў 1868 годзе побач узнялася пад трыма вытанчанымі невялікімі франтонамі брама-званіца з дастаткова вялікім арачным праездам.

Мястэчка і сядзіба зазналі эканамічны і культурны росквіт пры Іахіме Літавары Храптовічы, які займаў высокую пасаду канцлера ў Вялікім Княстве Літоўскім. Менавіта пры ім у Шчорсах і Вішневе былі адкрыты павятовыя школы. Непасрэдна побач з мястэчкамі, на другім беразе Альшанкі, у сядзібе Храптовічаў за кароткі час узвялі гаспадарчыя пабудовы, дзе пачалі прыбыткова працаваць розныя прадпрыемствы: вінакурня, цагляны ды ганчарны заводы, шкляная гута, суконная фабрыка. А самае галоўнае — Храптовічы першыя ва ўсім ВКЛ пабудавалі доменную печ, пры якой адначасова адкрылі кузню і плавільны цэх. У выніку атрымалася самая вялікая металургічная мануфактура таго часу на землях, якія сёння займаюць Літва і Беларусь. З 1773 года прадпрыемства, працуючы на рудзе, якая паступала з Налібоцкай пушчы, выдавала каля 25 тысяч пудоў жалеза ў год. Частка яго ішла ў злітках, другая — у выглядзе літых рашотак, агароджаў, крыжоў, розных прылад ды прадметаў хатняга ўжытку. Нешта прадавалася як паўфабрыкат.

Падчас паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, у 1794-м, у сядзібе Храптовічаў выраблялася зброя для паўстанцаў. Пасля падаўлення паўстання войскі зруйнавалі ўсе вытворчыя прадпрыемствы. Храптовічам, аднак, не спатрэбілася шмат часу, каб іх аднавіць, і дзейнічалі заводы амаль да 1870 года.

Сёння ад былых гаспадарчых пабудоў засталася толькі адна каменная будыніна з датай на сцяне — 1810 год. Магчыма, гэта былы плавільны цэх. Добра выглядаюць цагляны дом аканома, арачны мост у парку, па якім і сёння ездзяць туды-сюды на любой тэхніцы. Непадалёк ад Вішнева захаваліся рэшткі яшчэ адной сядзібы Храптовічаў, якая лічылася палаўнічай рэзідэнцыяй. Тут можна яшчэ ўбачыць палаўнічы дом, вартоўню з каменю і рэшткі пейзажнага парку.

Цікавы факт: Вішнева — радзіма дзявятага прэзідэнта Ізраіля, лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру Шымона Перэса, які нарадзіўся тут у 1923 годзе. На могілках пахавана паэтка Канстанцыя Буйло, якая жыла і працавала ў Вішневе каля сямі гадоў. Побач — магіла паэта Пятра Быцеля. Ён у Вішневе працаваў настаўнікам. Верагодней за ўсё, у гэтым былым мястэчку пахаваны і Сымон Будны — філосаф, гуманіст, які скончыў свой жыццёвы шлях у 1593 годзе.

На здымку вы бачыце выяву вішнеўскай праваслаўнай святыні ў гонар Святых Касмы і Даміяна. Пабудаваная царква з палявога каменю і цэглы ў рэтраспектыўна-рускім стылі ў 1865 годзе. Зусім нядаўна храм капітальна адрамантавалі, і ён набыў новую, вельмі ўдалую, на мой погляд, афарбоўку. Прыведзена ў належны стан і тэрыторыя вакол святыні, з'явілася шмат кветак і зеляніны.

Пакідаючы Вішнева, не магу пазбавіцца пачуццяў: я яшчэ сюды вярнуся. Таму не кажу ў нечым сумнае «Бывай!», а развітваюся больш цёплым і сардэчным «Да сустрэчы!».

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
11.10.2018 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1290

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 3844

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.